ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дарожным дадаткам „Прафух“)

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок комп. пасьля тэксту—50 к., Іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. збадку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

Пралетары усіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-80
Навны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
„ абвестак	7-81

ПЯТНІЦА, 22 жніўня 1930 г.

№ 195 (3793)

Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Вайна бязьдзейнасьці і безадказнасьці ў рабочым забесьпячэньні

Пытаньні забесьпячэньня ня зыходзяць з парадку дня рабочых канфэрэнцый, сходаў партыйных і савецкіх арганізацый. У пастановах ЦК КП(б)Б ня раз памячаліся практычныя мерапрыемствы. У дзесятках і сотнях допісах, якія друкаваліся ў нашай прэсе, рабочымі рабіліся канкрэтныя прапановы, і паказаньні. Але ня гледзячы на ўсё гэта, у рабоце забесьпячэнчых і каапэрацыйных арганізацый няма паляпшэньня. Наадварот, у апошнія дні выявіўся рад новых прарываў, якія зусім не апраўдваюцца аб'ектыўнымі акалічнасьцямі.

Усё больш часта і часта чутны спасыланьні на аб'ектыўныя цяжкасьці. Усё больш часта і часта апраўдваюць сваю, нікуды ня вартую, работу цяжкасьцямі росту, цяжкасьцямі рэканструкцыйнага пэрыяду. Так, у нас цяжкасьці ёсьць, так — гэта цяжкасьці ўздыму, росту, а не заняпаду. Але ці выкарыстаны ўсе нашы магчымасьці? Ці зроблена ўсё для лепшага забесьпячэньня рабочых у межах рэсурсаў, якія ў нас ёсьць? Ці процістаўлена аб'ектыўным цяжкасьцям актыўнасьць забесьпячэнчых арганізацый?

На ўсе гэтыя пытаньні мы павінны даць адмоўны адказ. Зроблена мала, злачынна мала. Практыка нашых беларускіх загатоўцаў і каапэрацыі штодзённа, кожную гадзіну пацьвярджаюць правільнасьць вядомай заявы тав. Сталіна на 16 зьезьдзе партыі.

Прыпомнім яе:

«У гэтым вінаваты бюракратызм нашага забесьпячэнчага апарату наогул, бюракратызм спажывецкай каапэрацыі перш за ўсё. Апарат каапэрацыі больш клапаціцца аб балянсе... Выходзіць, што каапэрацыя дзейнічае ў даным выпадку, не як сацыялістычны сэктар, а як сваясаблівы сэктар, заражаны нейкім нэпманскім духам. Пытаньне, каму патрэбна такая каапэрацыя і якая карысьць для рабочых ад яе манаполіі, калі яна ня выконвае задачы сур'ёзнага паляпшэньня рэальнай зарплаты рабочых?»

Спынімся больш падрабязна на канкрэтных фактах з дзейнасьці загатоўчых і забесьпячэнчых арганізацый.

Вастрэй за ўсё стаіць пытаньне аб мясе і наогул прадуктах жывёлагадоўлі. Мы ведаем, што карэнны пералом на гэтым вучастку забесьпячэнчага фронту яшчэ немагчымы. Ведаем, што праблему жывёлагадоўлі нельга вырашыць на працягу 1-2 мес. Ведаем, што тут патрабуецца доўгая, упартая і настойлівая работа. Усё гэта так. Але як-жа загатаўляюцца тыя абмежаваныя запасы, якія мы маем? Як даходзяць яны да спажыўца? Няхай гавораць факты.

За першую дэкаду жніўня па БССР загатоўлена толькі 2,8 проц. мясного пляну, — рэальнага пляну, які ўлічваў нашы рэсурсы. Загатоўкі мяса вядуць тры арганізацыі: Белмяса, Белкаапсаюз і малочная каапэрацыя, — і ўсе яны знаходзяцца ў пэрманэнтнай грызьні паміж сабой. Фонды прамтавараў, вызначаныя для прэм'яваньня здатчыкаў мяса, выдаткоўваюцца на іншыя мэты. Загатоўчыя пункты ў большасьці выпадкаў зусім не апраўдваюць сваёй назвы. У лепшым выпадку гэта толькі прыёмачныя пункты, якія чакаюць прыгону жывёлы самымі сялянамі і калгаснікамі. Няма масавай арганізацыйнай работы, няма **арганізацыі прыцёку** мяса да загатоўчых пунктаў. У выніку — тыя мізэрныя лічбы загатовак, якія вылічваюцца адзінкамі процантаў.

Але ўсім гэтым яшчэ не завяршаецца **кола безадказнасьці** мясцовых арганізацый. Мяса, якое загатаўляецца, часта не даходзіць да спажыўца буйных рабочых цэнтраў. Яно спажываецца на месцы, злачынна раскрадаецца. Партыя патрабуе забесьпячэньня ў першую чаргу рабочых буйных цэнтраў. Але што да гэтага носьбітам **месьніцкіх** тэндэнцый. Іх зрок ня бачыць далей мясцовай званіцы. Што ім індустрыялізацыя краю і яе патрэбы? Што ім да тэй гэраічнай барацьбы, якая вядзецца за варштатам і машынай для ажыцьцяўленьня пляну вялікіх работ? Людзі з шорамі на вачох, якія ставяць вышэй за ўсё свае мясцовыя інтарэсы, — падрываюць наша будаўніцтва, нашу барацьбу. **І з імі партыя і савецкія органы будуць весьці бязьлітасную і рашучую барацьбу.**

Рад раённых арганізацый праяўляе поўную бязьдзейнасьць. Гэтаму трэба пакласьці канец. **За пасьпяховы ход мясазагатовак адказваюць ня толькі загатоўцы, але і ўся раённая арганізацыя.**

Яшчэ з большымі абураючымі і злачыннымі фактамі мы сустракаемся на другім вучастку забесьпячэнчага фронту, на вучастку забесьпячэньня гародніной. Гародніны ў нас даволі. Ею БССР можа з лішкам пакрыць ня толькі свае патрэбнасьці, але і вывазіць у вялікай колькасьці ў іншыя спажываючыя цэнтры Саюзу. І ўсё-ж гародніна ў нашых беларускіх гарадох зьяўляецца востра дэфіцытным таварам. Усё-ж на сёнешні дзень Менск застаўся бяз бульбы.

Гародніна ёсьць, але каапэрацыя няздольна яе загатовіць. Гародніна ёсьць, але яна не даходзіць да рабочага спажыўца. Ствараецца зусім недапушчальнае становішча, калі мы літаральна сярод агародаў, застаемся бяз бульбы, гуркоў, памідораў і капусты.

Некалькі тыдняў таму назад МЦРК закідваў месцы тэлеграмамі аб спыненьні адгрузкі бульбы. А зараз тэлеграфныя правады перадаюць мольбы каапэрацыйных бюракратаў аб узмоцненай адпраўцы ў гарады гэтага востра «дэфіцытнага» прадукту. На сходзе, прысьвечаным пытаньням рабочага забесьпячэньня, кіраўнік Калгасцэнтру тав. **Міцькоў** гэтымі днямі паведаміў, што шмат **калгасаў задыхаюцца ад лішкаў гародніны,** ня ведаючы, куды іх дзяваць. Каапэрацыйныя арганізацыі адмаўляюцца іх закупляць.

Крызіс збыту ў калгасах і чаргі ў крамах з гароднінай — вось балянс бязьдзейнасьці нашых каапэрацыйных арганізацый, бязьдзейнасьць, якая грае на руку спэкулянту і гандляру і так моцна б'е па рэальнай зарплаце рабочага.

«Зьвязда» ня раз паказвала на абураючыя дэфэкты ў рабоце каапэрацыі. Нашы рабкоры і брыгадзіры сыгналізавалі магчымасьць перабояў з забесьпячэньнем бульбы. Падаваліся факты зрыву загатовак. Уносіліся прапановы аб арганізацыі правільнага разьмеркаваньня прадуктаў. Але ўсе нашы каапэрацыйныя арганізацыі заставаліся глухімі да сыгналаў друку. Мы не атрымалі ні аднаго водгуку ад зацікаўленых ведамстваў. Маўчыць МЦРК. маўчыць Белкаапсаюз. Маўчаць Белплодагародніна, Белсадсаюз. Са змоваю маўчаньня сустрэлася савецкая грамадзкасьць, устрывожаная прарывамі ў рабоце забесьпячэнчых арганізацый.

Агідныя адносіны да патрэб рабочых ня могуць быць больш цярпімы. Работу каапэрацыі — **пад кантроль рабочай грамадзкасьці.** Той невялікі, вельмі ценкі, а часамі праблематычны пласт актыву, якім абрасьлі каапэрацыйныя «главкі», яўна невыстарчальны і ня можа нас ніяк задаволіць. Трэба падняць масы, трэба прыцягнуць іх да актыўнага ўдзелу ў барацьбе за рабочае забесьпячэньне, трэба чула прыслухоўвацца да іх голасу.

У заключэньне некалькі слоў **аб удзеле прафсаюзаў** у барацьбе за рэальную заработную плату. Мы ня будзем доўга спыняцца на гэтым пытаньні. Падамо толькі адзін факт, які гаворыць сам за сябе. На важнейшым сходзе па рабочым забесьпячэньні, скліканым брыгадай УсеЦСПС, цэнтральныя праўленьні прафэсыянальных саюзаў БССР красаваліся сваёй адсутнасьцю...

Каапэрацыі неабходна стаць сапраўдным сацыялістычным сэктарам, адкінуць свой нэпманскі і гандлярскі дух. Супроцьпаставіўшы бальшавіцкую энэргію цяжкасьцям росту, яна дабіецца актыўнага балянсу, балянсу посьпехаў і дасягненьняў. І ў гэтым ёй павінны дапамагчы ў першую чаргу прафсаюзы.

Мы чакаем ад органаў РСІ і пракуратуры сапраўды рашучых, бязьлітасных мер у адносінах да канкрэтных вінаватых у зрыве выкананьня пляну рабочага забесьпячэньня.

Новая агідная правакацыя

Польскі фашызм перажывае востры палітычна-гаспадарчы крызіс. Арганічнай часткай гэтага агульнага крызісу, яго адлюстраваньнем — зьяўляецца крызіс польска-панскай акупацыі ў Заходняй Беларусі. Гэта выяўляецца ў поўным гаспадарчым развале Заходняй Беларусі, у магутным уздыме рэвалюцыйнага руху працоўных мас, які адбываецца на глебе гэтай гаспадарчай катастрофы. Заходняя Беларусь прадстаўляе сабой сапраўдны рэвалюцыйны вулкан.

Падзеі, якія разыграліся ў Гарадзеншчыне (гл. паведамленьне ў сёнешнім нумары) зьяўляюцца выразнай ілюстрацыяй цяперашняга становішча ў Заходняй Беларусі.

Гэтыя падзеі сьведчаць перш за ўсё аб росьце баявой гатоўнасьці мас. Таксама як і ўсе апошнія выступленьні рабочых і сялянскіх мас, — сялянскае выступленьне ў вёсцы Алекшыцы адзначаецца ўпартасьцю, рэвалюцыйнай волі працоўных мас.

Падзеі ў Гародзеншчыне гавораць аб росьце ўплыву рэвалюцыйнага лягеру на З. Б. Асобна трэба адзначыць рост аўтарытэту беларускіх рабоча-сялянскіх паслоў сярод працоўных мас. На заклік рабоча-сялянскіх паслоў, наперакор забароне паліцыі, зьбіраюцца тысячы працоўных, дэманструюць сваю баявую гатоўнасьць. Масы даваяюць свае ім дэпутатам, на іх заклік яны гатовы ісьці ў бой пад кулі, і нават на сьмерць.

Яшчэ раз гэтыя падзеі пацьвердзілі тое, што працоўныя масы Заходняй Беларусі ідуць за рэвалюцыйным лягерам. Перад разьбітым карытам знаходзіцца група беларускіх нацыянал-фашыстых, якія вядуць за сабою толькі жменьку беларускіх кулакоў. Таксама, як і ўсе падзеі за апошні час на З. Б., як выбары ў розных паветах. Зах. Беларусі— падзеі ў Гародзеншчыне гэта пацьвердзілі.

У фашысцкай Польшчы пануе надзвычайны тэрор. Асабліва разьюшаны тэрор фашызм ужывае ў Зах. Беларусі ў адносінах да рэвалюцыйных рабочых і сялян. Нават «недатыкальнасьць паслоў», якая абвешчана польскай канстытуцыяй, існуе толькі для паслоў буржуазіі і яе служкаў. У фашысцкай Польшчы ўжо многа рэвалюцыйных дэпутатаў кінута ў турмы і на катаргу.

Гэтым не абмяжоўваецца крывавая эпапэя тэрору ў адносінах да рабоча-сялянскіх дэпутатаў. У апошні час фашызм увёў у сыстэму, у адносінах да рэвалюцыйных дэпутатаў, бандыцкія мэтады, пазычаныя з арсэналу дзікейшай крывавай практыкі чорнасоценнага царскага «саюзу русскага народу». Фашысцкія ўлады, рукамі пераапранутых паліцэйскіх і дэфэнзыўшчыкаў, ппатных забойц, зьбіваюць да поўсьмерці рабоча-сялянскіх дэпутатаў, як толькі яны адважваюцца дзе-небудзь выступіць да рабочых і сялян. Так, на першамайскіх мітынгах былі цяжка паранены пераапранутымі паліцэйскімі ў розных кутках Зах. Беларусі —дэпутаты ГРЭЦКІ, ДВАРЧАНІН і інш.

Але рабоча - сялянскія дэпутаты не даюць тэрарызавацъ сябе кастэтам, дубінкай і рэвальвэрам. Вось фашызм ужывае простую дзікую правакацыю, для таго, каб ізаляваць рабоча-сялянскіх дэпутатаў ад мас.

Падобную страшэнную агідную правакацыю фашысцкія ўлады, як відаць са зьмешчанага паведамленьня, маюць намер ужыць да беларускага рабоча-сялянскага паслы Дварчаніна. Дэфэнзыва выдумвае вэрсію аб тым, што нібы Дварчанін страляў у паліцэйскіх. Гэты правакацыйны мэтад ня новы.

Гэтыя агіднейшыя мэтады, якія фашызм ужывае да «недатыкальных» рабоча-сялянскіх паслоў гаворыць толькі аб шаленстве, аб жаху польскіх акупантаў перад узрастаючым рэвалюцыйным рухам у Заходняй Беларусі.

На гэту новую правакацыю працоўныя масы Заходняй Беларусі адкажуць узмацненьнем сваёй барацьбы супроць фашызму, яшчэ большым згуртаваньнем сваіх радоў навакол чырвоных сьцягаў рэвалюцыйнага лягеру.

Працоўныя масы Савецкай Беларусі з вялізарным абурэньнем і пратэстам адкажуць на гэтую новую правакацыю польскага фашызму ў адносінах да беларускага рабоча-сялянскага паслы.

Па Савецкім Саюзе

ПЕРШЫЯ БАТАЛЬЁНЫ ЭНТУЗІЯСТЫХ ПЯЦІГОДКІ

СЬВЯРДЛОЎСК, 21. У Чалябінску фармуюцца першыя батальёны энтузіястых сацыялістычнай пяцігодкі. У БАТАЛЬЁНЫ ПРЫМАЮЦЦА ВЫКЛЮЧНА ПРЫКЛАДНЫЯ ЎДАРНІКІ. Задачы батальёнаў: ліквідацыя вытворчых прарываў, арганізацыя сустрэчнага пляну, разгортваньне масавага ўдарніцтва. Закон энтузіястых быць першымі ў вытворчасьці. Ня кідаць да канца пяцігодкі сваё прадпрыемства. Весьці на грамадзкім буксіры сваю зьмену, цэх, прадпрыемства. У першы батальён імя «Праўды» ўступіла 16 ударнікаў Сталінграда, 130 ударнікаў заводу Калесенка Чалябінскі, з іх 13 ударніц.

ЗАЯВА АМЭРЫКАНСКАГА РАБОЧАГА, ЗБЬІЎШАГА НЭГРА

СТАЛІНГРАД, 21. Амэрыканскі работнік Люіс, зьбіўшы нэгра Рабінзона на трактарным заводзе падаў наступную заяву: «Учынак мой 24-га ліпеня натуральна выклікаў вялікае абурэньне савецкіх рабочых. Ня ўсе амэрыканскія рабочыя разумеюць сапраўдны сэнс нацыянальнай і расавай варожасьці. Гэта неразуменьне выкарыстоўваецца супроць рабочых. Толькі цяпер я разумею, якую грубую памылку я зрабіў, будучы пад уплывам шавіністычных уплываў. Я прашу рабочых СССР даравацъ мне мой учынак. У будучым я ніколі ня буду прыхільнікам нацыянальнай варожасьці. Я горача вітаю ўсіх тых, хто змагаецца за поўную роўнасьць рас і нацый.

АДЧЫНІЎСЯ ПЕРШЫ ЎСЕСАЮЗНЫ ЗЬЕЗД ФІЗЫКАЎ

АДЭСА, 20. Адчыніўся першы ўсесаюзны зьезд фізыкаў. Адчыненьне зьезду прайшло пад знакам цеснага адзінства паміж навукай і працай. У ганаровы прэзыдыум абраны Палітбюро ЦК УсеКП(б) і Палітбюро ЦК КП(б)У. Пасланы прывітальныя тэлеграмы ЦК Усе КП(б) і ЦК КП(б)У, V кангрэсу Прафінтэрну і ўрадам СССР і УССР.

ПАРАДАК І ФОРМЫ РАЗЬЛІКАЎ КАЛГАСАЎ СА СВАІМІ ЧЛЕНАМІ І ІНШЫМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ

Наркамфін СССР і Калгасцэнтр зацьвердзілі палажэньне аб парадку і форме разьлікаў калгасаў з сваімі членамі і іншымі арганізацыямі і ўстановамі.

Праўленьні калгасаў вядуць разьлікі з сваімі членамі ў грашовых выразах. Улік працоўных затрат кожнага калгасу вядзецца ў працаднёх з пераводам іх у грашовы выраз пасьля сканчэньня апэрацыйнага году. На працягу году члены калгасу атрымліваюць грошы і прадукты па папярэдніх цэнах. Кожны член калгасу мае на руках разьліковую кніжку, у якую заносяцца выдачы і ўтрыманьні. У межах калгасу недапушчальны разьлікі пры дапамозе грашовых сурагатаў.

Усе калгасы абавязаны вытвараць свае разьлікі з дзяржаўнымі, каапэрацыйнымі і грамадзкімі прадпрыемствамі і ўстановамі праз сельска-гаспадарчыя таварыствы і аддзяленьні Дзяржбанку. Усе грашовыя сродкі калгасаў павінны зьмяшчацца на бягучы рахунак у раённых разьлікавых цэнтрах. Касавая наяўнасьць, неабходная для штодзённай дзейнасьці калгасаў, знаходзіцца ў мясцовай апчадчай касе або ў праўленьні калгасу. Разьлікі паміж калгасам і спажыўкаапэрацыяй вытвараецца шляхам пералічэньня сум з бягучага рахунку калгасу.

НОВЫЯ ОРГІІ ФАШЫСЦКАГА ТЭРОРУ Ў ЗАХ. БЕЛАРУСІ

Крывавыя расправы паліцыі з беспрацоўнымі

АРЫШТАВАНЫ БЕЛАРУСКІ РАБОЧА-СЯЛЯНСКІ ПАСОЛ ДВАРЧАНІН

ВІЛЬНЯ, 21. Учора, а 9 гадз. раніцы ў вёсцы Алекшыцы, Гародзенскага павету адбыўся вялізарны мітынг, скліканы пасламі Беларускага Рабоча-Сялянскага соймавага клюбу т. т. ДВАРЧАНІНОМ і ВАЛЫНЦОМ. Ня гледзячы на тое, што мітынг быў паліцыяй забаронены—сабралося некалькі тысяч сялян з ваколічных вёсак. Прамовы рабоча-сялянскіх паслоў былі спатканы бурным ухваленьнем з боку прысутных.

Паліцыя сабрала ўсе наяўныя сілы для разгону мітынгу. Паліцэйскія атакавалі сялян. Аднак, сяляне аказалі паліцыі актыўнае супраціўленьне. На чале мас ішлі дзеці і жанчыны. На паліцэйскіх пасыпаліся каменьні. Бачачы настрой мас, паліцэйскія не адважыліся страляць. Яны стрэлілі ў паветра, адступілі і выклікалі «дапамогу» з Гародні. Пасьля таго, як прыбыў паліцэйскі атрад з Гародні, сялянская маса была разагнана.

Гародзенская паліцыя і дэфэнзыва, відавочна. «па паказаньні зьверху» выдумалі правакацыйную вэрсію аб тым, што беларускі рабоча-сялянскі пасол Дварчанін страляў у паліцыю. Дварчанін арыштаваны.

Польскі фашысцкі друк разгортвае правакацыйную кампанію ў сувязі з гэтымі падзеямі. Афіцыёз «Газэта Польска» ў камэнтарах да інсынуяваных паведамленьняў аб падзеях у Гародзеншчыне—патрабуе «суровых мер».

МАСАВЫЯ АРЫШТЫ Ў ЗАХ. БЕЛАРУСІ

ВАРШАВА, 21 Паводле вестак газэт, на працягу апошніх дзён у Вільні і акрузе былі зроблены масавыя арышты. Паводле паліцэйскіх паведамленьняў, паліцыя нібы ліквідавала каля сотні ячэек камуністычнай партыі ў Заходняй Беларусі і арыштавала некалькі членаў ЦК кампартыі. Паліцыя пасьля вобыскаў апячатала памяшканьне прафсаюзных арганізацый і арыштавала каля сотні чалавек.

РАБОЧЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ Ў АБАРОНУ СССР

ВАРШАВА, 19. У Варшаўскім раёне 17-га жніўня адбыліся рабочыя дэманстрацыі пратэсту супроць сьвяткаваньня так званага «цуду на Вісьле».

У Радзіміне (дзе разыгралася ў 1920 г. рашаючая бітва за Варшаву), Маніках і Вышкаве адбыліся дэманстрацыі пад лёзунгам: «Абараняйце СССР».

У Вышкаве адбылася сутычка паміж дэманстрантамі і паліцыяй, якая арыштавала некалькіх рабочых.

ШМАТЛІКАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ БЕСПРАЦОЎНЫХ У ЛОДЗІ

ВАРШАВА, 19. У Лодзі адбылася шматлікая дэманстрацыя беспрацоўных.

Беспрацоўныя імкнуліся захапіць біржу працы. Паліцыя разагнала дэманстрантаў. Сярод беспрацоўных многа цяжка параненых.

У АБНІМКАХ З БЕЛАБАНДЫТАМІ

ВАРШАВА, 19. Прэзыдэнт рэспублікі Масьціцкі стаў на чале арганізацыі, якая падрыхтоўвае назначаныя на 18 кастрычніка ўрачыстасьці з прычыны гадавіны адступленьня чырвоных войск ад Варшавы.

У склад камітэту па арганізацыі сьвяткаваньня ўваходзяць страшыня савету Шымански і генэрал Гурэцкі. Сьвяткаваньні мяркуецца арганізаваць вельмі шырокія, а ўдзелам прадстаўнікоў замежных палякаў і прадстаўнікоў белагвардзейскіх часьцей, якія аражаліся на баку Польшчы.

ПАДАЗРОНАЯ ІНФАРМАВАНАСЬЦЬ І ПАТАЕМНАЕ МАЎЧАНЬНЕ

ВАРШАВА, 21. Патаемнае маўчаньне польскіх улад па пытаньні аб нібы выкрытай ў Югаславіі арганізацыі замаху на савецкае паўпрэдзтва ў Варшаве пра цягваецца.

Увесь польскі друк перадрукаваў гэтымі днямі паведамленьне ангельскай газэты «Бірмінгам Пост» аб ходзе сьледзтва, у якім паказваецца, што сьлед навёў польскія сьледчыя ўлады на Гародню. Арганізатарам замаху аказаўся нібы нейкі выкладчык чужаземных моваў, які прыехаў у Гародню з СССР. Гэты выкладчык падазраваўся польскімі ўладамі ў тым, што ён у Польшчы нелегальна займаецца антыдзяржаўнай дзейнасьцю. Пасьля замаху выкладчык чужаземных моў нібы ўцёк ў Югаславію.

Органы польскага друку непакояцца з-за адсутнасьці якіх-небудзь вестак аб выніках сьледзтва і дзіўнай інфармаванасьцю чужаземнага органу друку і патрабуюць аўтарытэтных растлумачэньняў аб тым, як сапраўды абстаіць справа з замахам. «Работнік» цяпер ужо сумняваецца, ці арыштаваны наогул арганізатар замаху.

АФІЦЫЙНА НІЧОГА НЕВЯДОМА

ВАРШАВА, 20. У прэзыдыуме рады міністраў адбылася нарада, прысьвечаная надыходзячай канфэрэнцыі аграрных дзяржаў у Варшаве. У нарадзе прынялі ўдзел прэм'ер Славэк, міністар замежных спраў Залескі, а таксама міністры зямляробства і фінансаў. Хоць канфэрэнцыя павінна адчыніцца ўжо 28-га жніўня, але пакуль яе праграмы афіцыйна нічога невядома.

ДЭФЭНЗЫЎНАЯ НАВУКА ЦІ НАВУКОВАЯ ДЭФЭНЗЫВА

ВАРШАВА, 21. Уладамі зацьверджан статут новага таварыства пад назвай «таварыства навуковага дасьледваньня ка мунізму». Гэта таварыства ставіць сабе мэтай змаганьне з камунізмам шляхам дакладаў, выдавецкай дзейнасьці і публічных дыскусій. Газэты паведамляюць, што ў дзейнасьці новага таварыства прымуць удзел чыноўнікі, якія займаюц ца камунізмам у сілу сваіх службовых абавязкаў. Інакш гаворачы, новае «навуковае» таварыства будзе, відавочна, кіравацца былымі паліцэйскімі чыноўнікамі, якія спэцыялізаваліся ў пытаньнях барацьбы з камуністычным рухам.

Варшаўскае выданьне пан-эўрапэйскай камэдыі

Брыянаўскі плян аб'яднаньня ўсёй Эўропы супроць СССР і ПАЗШ спаткаўся з вялікімі цяжкасьцямі. Антлія ясна дала зразумець, што адмаўляецца ад ўсякіх пан-эўрапэйскіх камбінацый, якія пагражаюць яе адносінам з ПАЗШ і падрываюць яе сувязі дамініёнамі. Нямеччына глуха і Італія адкрыта паказалі на немагчымасьць правесьці ў жыцьцё задач пан-эўропы бяз удзелу Савецкага Саюзу і Турцыі.

Такім чынам, вялікія эўрапэйскія дзяржавы «падвялі» Брыяна. За ім найшлі па сутнасьці тыя краі, якія і раней знаходзіліся пад моцным уплывам Францыі: Югаславія, Чэхаславакія, Румынія, Польшча. Аднак, гэта акалічнасьць не ахаладзіла ні «аб'яднаўчага, ні антысавецкага, напалову французскага міністра замежных спраў. Цяпер **рукамі польскага ўраду Брыян падрыхтоўвае другое, праўда значна скарочанае, выданьне сваёй пан-Эўропы: «аграрны» блёк прыдунайскіх і прыбалтыцкіх краёў пад кіраўніцтвам Польшчы.**

Для выкананьня заданьня Брыяна польскі ўрад 28-га жніўня склікае канфэрэнцыю ў Варшаве. У варшаўскім спэктаклі, апрача верных васалаў Францыі (Югаславіі, Чэхаславакіі, Румыніі) — будуць прадстаўлены Вэнгрыя, Баўгарыя, Эстонія і нават Латвія.

Праграма канфэрэнцыі не апублікавана. Афіцыйныя весткі, якія падаюцца газэтамі (напр. латвійскай —«Прыва Зэмэ»), гавораць аб тым, што на канфэрэнцыі будуць нібы абмяркоўвацца выключна «гаспадарчыя пытаньні», а менавіта: меры да зьнішчэньня ўзаемнай канкурэнцыі паміж краямі-удзельнікамі на рынку с.-г. прадуктаў, мэтады змаганьня супроць дэмпінгу (вываз па штучна зьніжаных цэнах) і штучнае зьніжэньне цэн на сельска-гаспадарчыя прадукты і вэтэрынарныя пытаньні.

Няхай першае і трэцяе пытаньне «чыста гаспадарчыя». Затое другое пытаньне — асабліва, калі ўспомніць, што ў «штучным забесьпячэньні» сельска-гаспадарчых цэн настойліва абвінавачваюць Савецкі Саюз — **мае зусім пэўны і прытым яўна антысавецкі характар.** У гэтым-жа пераконваюць і ўпартае нежаданьне ініцыятараў канфэрэнцыі апублікаваць падрабязную і афіцыяльную яе праграму і выключэньне з ліку запрошаных вялізарнейшай аграрнай краіны ўсходняй Эўропы — СССР і прыцягненьне зусім не аграрнай Чэхаславакіі. Усё гэта з выстарчальнай выразнасьцю паказвае, што **ў цэнтры ўвагі канфэрэнцыі стаяць далёка не гаспадарчыя, а палітычныя пытаньні.**

Ня цяжка здагадацца, якая «палітыка» кіруе польскім урадам пры скліканьні варшаўскай канфэрэнцыі. Гэта ўсё тая-ж брыянаўская «аб'яднальная» і **антысавецкая палітыка, якая сарвалася на пан-эўрапэйскіх камбінацыях, а цяпер гатова задавальняцца меншым: усходня-эўрапэйскім блёкам, накіраваным супроць СССР.** Потым варшаўскі праект, у аднаку ад першай пан-Эўропы завостраны ня столькі супроць ПАЗШ, колькі супроць Нямеччыны і Італіі. Паслушны выканаўца волі свайго гаспадара — французкага капіталу, польскі ўрад прабуе, пад лёзунгам «барацьбы з савецкім хлебным экспартам», скалаціць усходня-эўрапэйскі блёк, які могбы саслужыць Францыі патвоінную службу: умацаваць пазыцыі Францыі перад тварам паўстанцаў супроць Вэрсаля, Нямеччыны і Італіі і **стварыць патрэбныя палітычныя і стратэгічныя прадпасылкі для выступленьня супроць СССР.**

Наўрад ці, аднак, другому выданьню брыянаўскай пан-Эўропы суджаны большы посьпех, чым першаму. Заняпада рознастайныя і супярэчныя гаспадарчыя і палітычныя інтарэсы запрошаных на варшаўскую канфэрэнцыю краін, каб французска-польская «гульня» магла ператварыцца ў жыцьцё. Ужо адмова Літвы прымаць удзел у канфэрэнцыі паказальная. Цяжка, далей дапусьціць, каб на польска-французскую вудачку лёгка злавіліся Латвія, Эстонія, Баўгарыя і Вэнгрыя. Бо і на закліканьне Румыніі і Югаславіі Вэнгрыя адказала: спачатку задавальніце мае **палітычныя** прэтэнзіі, а потым паговорым і аб «гаспадарчых» пытаньнях. Можна чакаць падобных-жа адказаў і з боку Баўгарыі, Латвіі і Эстоніі. Такім чынам, і другому выданьню «пан-Эўропы» пагражаюць тыя-ж няжаксьці, якія ўзьніклі і пры першым яе выданьні.

Калі-б Нямеччына згадзілася прадаць сваю дружбу Францыі за «пераглядз» усходніх межаў (Сілезія, польскі калідор, Данцыг), далучэньне Аўстрыі, зварот калёній і права ўзбройвацца, дык аналёгічныя патрабаваньні высунуць таксама Літва, Вэнгрыя і Баўгарыя па адрасе сваіх больш «ашчасьліўленых» вайной суседзяй.

Такім чынам, паміж мэтамі варшаўскай канфэрэнцыі і іх ажыцьцяўленьнем ляжыць доўгі і цяжкі шлях. Але, **як этап у разьвіцьці антысавецкіх пляноў, варшаўская канфэрэнцыя заслугоўвае самай сур'ёзнай увагі савецкай грамадзкасьці.** На ёй будзе высьвятляцца тая цана, якую Францыі і Польшчы давядзецца заплаціць прыдунайскім і прыбальтыцкім краінам за ўдзел у антысавецкіх плянах польскай ваеншчыны, французскіх імпэрыялістых.

А. Р.

ЛІЖУЦЬ БОТЫ ПІЛСУДЗКАГА

ВАРШАВА, 20. Старшыня сойму пэпэсавец Дашынскі выступіў у Скавіне (Кракаўскае ваяводзтва) з вялікай палітычнай прамовай.

Цяперашняя Польшча, — заявіў Дашынскі, — стала паліцэйскай дзяржавай: Кожны унтэр лічыць, што мае права зьдзекваца над дэпутатамі сойму. Кіруючая галоўка дазваляе сябе ўсялякія блазэнскія ўчынкі. Адны пагражаюць пераломаць косьці, другія — арганізуюцца для таго, каб перарэзаць вораты. Дашынскі з крыўдай падкрэсьлівае, што нават у сьвята «перамогі над масквічамі» польская грамадзкасьць не змагла аб'яднацца.

У краі пануе жудасная галеча і беспрацоўе, прамысловасьць знаходзіцца ў стане дэградацыі.

Сойм закрыты і ў выніку гэтага ў краі нязвычайна вострая ўнутраная барацьба.

Ёсьць адзін чалавек у Польшчы, ад якога многае залежыць, і гэты чалавек — Пілсудзкі. Ён парваў з усімі кампрамісамі, якія так неабходны для нармальнага жыцьця краю. Пілсудзкі можа зьмяніць пануючую жудасную сыстэму. На сёнешні дзень многае залежыць ад Пілсудзкага, калі ён хоча знайсьці мірнае выйсьцё з створанага становішча. Таму прыходзіцца апэляваць да гонару Пілсудзкага, каб ён адмовіўся ад цяперашняга прынцыпу кіраўніцтва палякамі, як заваяванай нацыяй.

На V кангрэсе Прафінтэрну

НАСУСТРАЧ РАШАЮЧЫМ БАЯМ

На вячэрнім пасяджэньні 19-га жніўня па кангрэсе Прафінтэрну працягваліся спрачкі па дакладзе тав. Лазоўскага і па дакладзе тав. Гекэрта.

Прадстаўнік Парагваю расказаў аб становішчы пралетарыяту і аб стане прафруху Парагваю.

ВА ЎМОВАХ ФЭАДАЛЬНАЙ ЭКСПЛЕАТАЦЫІ

Становішча рабочае клясы надзвычай цяжкае. **Зарплата зусім нізкая. Сялянства падвяргаецца самай цяжкай фэадальнай эксплёатацыі.** Мы зварачаемся да міжнароднага пралетарыяту з просьбай дапамагчы нам у барацьбе супроць айчынных і чужаземных капіталістых.

Карэйскі дэлегат паведамляе аб становішчы пралетарыяту ў краі, дзе пануе японскі імпэрыялізм, які захапіў усе камандныя вышыні і выціскае з карэйскага пралетарыяту калёніяльныя звышпрыбыткі. Няўхільна ўзрастае лік самагубстваў сярод даведаных да роспачы карэйскіх рабочых. У асабліва цяжкім становішчы знаходзяцца работніцы і дзеці, праца якіх бязьлітасна эксплёатуецца.

Дэлегат ад Індо-Кітая адзначае, што ў гэтым краі рэвалюцыйны рух выліваецца ў крывавыя сутычкі рабочых з калёніяльнымі ўладамі. Мы прыкладзем усе намаганьні, каб змагацца пад сьцягам Леніна за сусьветную пралетарскую рэвалюцыю. Прадстаўнік Інданэзіі зварачае ўвагу кангрэсу на далёка невыстарчальную сувязь паміж рэвалюцыйным прафрухам эўрапэйскіх і калёніяльных краёў. **Кангрэс павінен паказаць шляхі цеснай сувязі эўрапэйскага і калёніяльнага рэвалюцыйнага прафруху.**

НАДЫХОДЗЯЦЬ БУЙНЕЙШЫЯ БАІ

Прадстаўнік Нямеччыны апісвае гэраічную забастоўку рабочых у Майнсфэльдзе. Усе сілы ўраду, усе войскі, паліцыя і прафбюракратыя былі мабілізаваны супроць бастуючых. Але майнсфэльдзкія пралетары арганізавалі рабочую самаабарону для барацьбы супроць паліцыі і рэфармісцкай прафбюракратыі. Зараз надыходзяць буйнейшыя баі ў гарнякоў Рура. Неабходна неадкладна прыступіць да дасканалай падрыхтоўкі і арганізацыі надыходзячай барацьбы.

Аб ролі рэвалюцыйнай рабочай моладзі гаварыў **прадстаўнік ПАЗШ.** Рэвалюцыйныя прафсаюзы павінны ўлічваць спэцыфічныя патрабаваньні моладзі. Трэба ня ахапіць агітацыяй і прапагандай. Трэба спыніць няўважлівыя адносіны і недаацэнку

15 верасьня—прызыў 1908 году

ЦП саюзаў ня ведаюць, як выяўляюцца тылаапалчэнцы

Прафарганізацыі і камсамол слаба рыхтуюцца да сустрэчы прызыўнікоў

Падрыхтавацца да сустрэчы маладога папаўненьня

Праз тры тыдні пачынаецца прызыў моладзі 1908 года. Партыя і ўрад далі дырэктыву аб своячасовым разгортваньні падрыхтоўчай працы да прызыву. Паводле гэтай дырэктывы павінна быць шырока разгорнута работа раённых і гарадзкіх троек садзейнічаньня прызыву, выяўленьня тылаапалчэнцаў—сацыяльна чужых элемэнтаў, якія рознымі спосабамі імкнуцца пралезьці ў Чырвоную армію, складаньню спісаў сямей чырвонаармейцаў для прадастаўленьня ільгот і г. д.

Атрыманыя весткі паказваюць, што ў гэтай галіне работы мы маем значны прарыў. Асобныя арганізацыі не ўявілі вялікага палітычнага значэньня, якое мае правядзеньне падрыхтоўчай работы і самага прызыву. Большасьць прафарганізацый палец аб палец ня ўдарылі ў падрыхтоўцы да прызыву. Да гэтага часу ні адно цэнтральнае праўленьне прафсаюзаў ня мае вестак як праводзіцца выяўленьне тылаапалчэнцаў, няма вучоту прызыўнікоў 1908 году. Большасьць ЦП саюзаў абмежавалася пасылкай цыркуляраў ФЗК і МК і лічаць справу скончанай. Што робіцца на прадпрыемствах прафсаюзы ня ведаюць. У ЦП саюзу мэталістых нават адказалі «у нас сацыяльна-чужых элемэнтаў няма». Адсэтуль патрэбна разумець, што работу на адсеву сацыяльна-чужых элемэнтаў праводзіць не патрэбна, гэты факт гаворыць, што ЦП саюзу мэталістых недаацэньвае палітычнай важнасьці выяўленьне тылаапалчэнцаў і мабілізацыі грамадзкай думкі вакол гэтай кампаніі, што дырэктыва партыі і ўраду саюзу мэталістых не датычыцца. Па саюзу сувязі ніякай работы па падрыхтоўцы да прызыву ня праводзіцца толькі таму, што ЦП саюзу распушчана. Ня лепшае становішча на іншых саюзах. У выніку гэтага, на прадпрыемствах слаба разгорнута культурна-масавая работа сярод прызыўнікоў.

Прадстаўнікі камсамолу (Менск) не зьяўляюцца на паседжаньні троек, ня гледзячы на частыя ім напамінаньні. ЦП саюзу працасьветы амаль нічога не зроблена ў падрыхтоўцы па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод прызыўнікоў. Гэта важнейшая справа пад поўнай пагрозай зрыву. Ніводнай арганізацыяй не пацулярызуецца мэта сацыялістычнага спаборніцтва сярод прызыўнікоў аднаго раёну з другім на лепшае правядзеньне прызыву і па барацьбе з традыцыямі рэкрутчыны, барацьбе з п'янствам, хуліганствам і г. д.

Аднэй з важнейшых задач зьяўляецца своячасовая падрыхтоўка для прыёму прызыўнікоў на зборны пункт, абсталяваньне інтэрнатаў, арганізацыя культурных гарбатняў, хат-чытальняў, перабудова работы клюбаў, кіно для абслугоўваньня прызыўнікоў. Але аб гэтым пакуль што ніхто ня думае. Прызыўнік з першага дня павінен адчуваць, што аб ім клапаціцца ўся грамадзкасьць.

Трэба даць рашучы адпор усім тым, хто лічыць непатрэбным рабіць клясавы адсеў. Партарганізацыі, камсамол, прафарганізацыі **павінны бездакладна абмеркаваць на рабочых сходах прадпрыемстваў і сходах беднаты кандыдатуры прызыўнікоў і выявіць сярод іх тылаапалчэнцаў, памятаючы, што Чырвоная армія чакае ня толькі фізычна здаровага, але клясава-сьвядомага папаўненьня, якое зможа з гонарам працягваць слаўныя баявыя традыцыі рабоча-сялянскай Чырвонай арміі.**

Прафарганізацыі, камсамол і каапэрацыя павінны разварушыцца і падрыхтавацца да сустрэчы маладога папаўненьня Чырвонай арміі.

Ш.

Чырвонаармейцы чакаюць адказу

НК Асьветы, Менпракурор і Бабруйскі пракурор, слова за вамі

Урадам дадзена жорсткая дырэктыва, што **ўсе скаргі чырвонаармейцаў павінны разглядацца ў двухтыднёвы тэрмін.** Але ця ўсе ўразумелі гэтую пастанову.

Дасланы матар'ял з «Чырвонаармейскай Праўды» малое ганебныя адносіны цэлага раду ўстаноў да разгляду скаргі чырвонаармейцаў. Асобныя ўстановы і арганізацыі адносяцца да справы вельмі бюракратычна, начыноўніцку і па некалькі месяцаў не адказваюць на іх скаргі. Курсант №-скага сап. бат. Саўцін скардзіўся, што над яго жонкай зьдзекуецца загадчык саўгасу Дайнічава (Бабруйшчына) — Кляймер. Не дае ёй работы, не дазваляе хадзіць па саўгасу, забараніе выказвацца на агульных сходах і г. д. Скарга была накіравана **Бабруйскай АКК РСІ** 17 студзеня г.г., рэдакцыяй было зроблена два напамінаньні. Прайшло 8 месяцаў, а адказу да гэтага часу няма. Чырвонаармеец №-скага арт. цалка Сычык падаў скаргу, што яго жонку няправільна пазбавілі стыпэндыі, якая займаецца на пэдагагічных курсах, скарга дасланa была 26 студзеня **НКА.** Ня гледзячы на некалькі напамінаньняў «Чырвонаармейскай Праўды», бюракраты з **НКА** да гэтага часу нічога не зрабілі і не адказалі на запытаньне рэдакцыі.

Чырвонаармеец №-скага цагран. атраду Епіфанаў А.—селянін бедняк, зьвярнуўся асабіста са скаргай да **Менскага акрпракурора,** а таксама і праз газэту аб водпуску для яго бацькі лесу. Заява была накіравана 23 студзеня 1930 г. **Рэдакцыя чатыры разы прасіла адказаць аб лёсе заявы Эпіфанава,** але пракуратура мусіць парашыла адказаць чырвонаармейцу, калі ён вернецца з Чырвонай арміі. **Бабруйская акрпракуратура на працягу цэлага году ўпарта не адказвае ні на адну скаргу чырвонаармейцаў.**

21 сакавіка г. г. акрпракуратуры была дасланa заява чырвонаармейца №-скага артпалка Драбышэўскага аб валакіце і бюракратызьме ў Бабруйскім аддзяленьні Дзяржвыдавецтва, справа якога ўжо цягнецца з мая 1929 г., адказу-ж яшчэ няма.

Гэткае становішча надалей немагчыма. ЦКК РСІ павінна заняцца гэтым пытаньнем і паказаць бюракратам, як трэба адносіцца да скарг чырвонаармейцаў.

А. Ш.

Чарапашынымі тэмпамі

Падрыхтоўка да прызыву на Бабруйшчыне

Побач з раёнамі, якія скончылі ў асноўным падрыхтоўку да прызыву, ёсьць такія раёны, дзе работа камісій па адсеву, выяўленьні з асяродзішча прызыўнікоў клясава-чужых і сацыяльна-небясьпечных элемэнтаў праводзіцца яшчэ чарапашынымі тэмпамі і далёка ня скончана. Узорам бюракратычнага, чыноўніцкага, безадказнага падыходу да работы па адсеву, які па сутнасьці справы можа быць ахарактарызаваны нічым іншым як яскравым праяўленьнем правага апартунізму, скажэньнем клясавай лініі партыі—зьяўляецца работа камісій па адсеву пры Любаньскім РВК і Бабруйскім гарадзкім савеце. Першая сваю работу яшчэ не пачынала, не пастаралася нават ужыць меры да афармленьня вестак аб сацыяльным і сямейна-маемасным стане прызыўнікоў. **У выніку работа як па адсеву, так і па разглядзе і прадстаўленьні ільгот сарвана.** Другая за тры месяцы вылявіла... 2 пазбаўленых выбарных праў з 500 чал. прызыўнікоў гораду. Пальцам не паварушыла, каб **разглядзець атрыманы матар'ял аб падсуднасьці 21 прызыўніка** і вырашыць каго з іх трэба адсеяць і хто можа служыць у арміі. За тры месяцы камісія зьбіралася ўсяго... 1 раз і то пасьля націску з боку гаркому партыі. А цяпер старшыня камісіі, прадстаўнік ад гарсавету кінулі работу і пайшлі ў адпачынак, сваіх намесьнікаў у курс справы не ўвялі і тыя ня ведаюць з чаго пачаць. Адначасова не дапамагаюць рабоце камісіі яшчэ ўсе грамадзкія арганізацыі. У радзе раёнаў (Любань, Жлобін і інш.), асабліва прафэсіянальныя арганізацыі амаль нічога не зрабілі, каб дапамагчы зрушыць работу з мёртвага пункту.

Вязумоўна, што ды такіх адносінах да справы адсеву ствараецца рэальная небясьпека, што ў армію здолее пралезьці кулацкі, клясава-варожы і сацыяльна-небясьпечны элемэнт.

Т-ін.

Забясьпечыць пачатак навучальнага году

Пастанова прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б аб падрыхтоўцы да навучальнага году ў ВНУ, ВТНУ і тэхнікумах

1. Прапанаваць НКАсьветы, ВСНГ, НКЗ і НКАЗ зараз-жа забясьпечыць кіраўнічымі кадрамі ўстановы, паведаміць НК РСІ выкананьне гэтага не пазьней 15 ЖНІЎНЯ.

2. Прапанаваць НКАсьветы, НКАЗ, ВСНГ і НКЗ зьнішчыць існуючую недагаворанасьць у пытаньні па падрыхтоўцы да навучальнага году і пад асабістую адказнасьць кожнага з наркомаў неадкладна выканаць пастанову СНК і ўрадавай камісіі па пытаньнях падрыхтоўкі да навучальнага году па ВНУ, ВТНУ і тэхнікумах.

3. Прапанаваць пад асабістую адказнасьць Будаб'яднаньня, Менбуду і Лесзагу і інш. арганізацыям, якія забясьпечваюць будаўніцтва матар'яламі ўжыць рашучыя крокі да таго, каб гаўпоўны корпус БДУ і інтэрнаты для студэнцтва БДУ, палітэхнікумаў і ВТНУ былі скончаны ва ўстаноўлены тэрмін.

Белпайгандлю, Саюзлесу і Тэкстыльгандлю забясьпечыць заяўкі на рамонт і абсталяваньне існуючых памяшканняў навучальных устаноў.

4. Паставіць пытаньне перад урадавай камісіяй па падрыхтоўцы да навучальнага году зараз улічыць існуючую навучальную і інш. карысную плошчу для навучальных устаноў і разьмеркаваць яе паміж навучальнымі ўстановамі, зыходзячы з дзяржаўных інтарэсаў, а не інтарэсаў паасобных навучальных устаноў.

5. Прапанаваць рэдакцыям газэт, НКАсьветы, ВСНГ Бел., НКАЗ і НКЗ зараз-жа праз друк правесьці шырокае растлумачэньне ўсіх пытаньняў укамплектаваньня навучальных устаноў пралетарскім студэнцтвам, шырока абвясьціць грамадзкасьць пра нанава адкрытыя навучальныя ўстановы, аб тэрмінах прыёму і пачатку заняткаў.

6. МЦРК зараз абсталяваць існуючыя пры навучальных установах сталоўкі і прыняць усе рашучыя захады да арганізацыі грамадзкага харчаваньня студэнцтва ў тэрміны, вызначаныя для пачатку заняткаў. Менгарсавету тэрмінова адвесьці патрэбную колькасьць па мяшканьня пад сталоўку.

7. Гарсавету неадкладна прыступіць да выкананьня пастаноў СНК аб забясьпячэньні жылой плошчай навуковых кадраў студэнцтва, паведаміўшы РСІ аб правядзеньні ў жыцьцё пастаноў СНК аб 10 і 50 проц. плошчы.

8. Даручыць ст. інспэктару НК РСІ Бел. т. Нікалаеву пэрыядычна правяраць работу ўсіх устаноў па падрыхтоўцы да навучальнага году.

ЦВК БССР—аб падрыхтоўцы кадраў па савбудаўніцтве і праве

Прэзыдыум ЦВК БССР заслухаў даклад Наркамасьветы і Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту аб становішчы і ўжытых мерапрыемствах па падрыхтоўцы кадраў на савецкім будаўніцтве і праве.

Усяго на факультэце савецкага будаўніцтва і права—166 ч. Навуковымі працаўнікамі факультэт забясьпечаны. Матар'яльнае становішча факультэту горшае ў параўнаньні з іншымі (малы процант забясьпечаных стыпэндыямі, адсутнасьць неабходнага памяшканьня і інш.).

Лік прыёму студэнтаў у гэтым годзе вызначаны ўсяго ў 80 чалавек, ня гледзячы на значна большыя запатрабаваньні з боку зацікаўленых цэнтральных ведамстваў (ЦВК СНК, НК РСІ, ВСНГ, НКУС).

Члены Прэзыдыуму ЦВК у сваіх выступленьнях падкрэсьлівалі тую вялікую ролю, якую мае факультэт савецкага будаўніцтва і права ў справе падрыхтоўкі кадраў для савецкіх устаноў і разам з тым адзначалі, што з боку адпаведных органаў, у асаблівасьці Наркам асьветы, нічога ня зроблена для папулярызацыі факультэту і стварэньня яму належных для яго работы ўмоў.

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў: прапанаваць Наркамасьветы **павялічыць лік прыёму студэнтаў у гэтым годзе да 150 чалавек** і ў бягучым намеціць далейшае павялічэньне прыёму ў суадпаведнасьці з запатрабаваньнямі зацікаўленых устаноў; прапанаваць Наркамфіну **павялічыць процант забясьпечанасьці «Саўбуду» стыпэндыямі, а таксама і разьмер паасобных стыпэндый;** даручыць Наркамасьветы ў 2-х месячны тэрмін падрыхтаваць пытаньне аб рэарганізацыі факультэту «Саўбуду» ў самастойны інстытут.

Г.

БАЛЯНС ПЕРАМОГІ

Калгас „Парастак Сацыялізму" разьмеркаваў ураджай

Чаму Кішкарэнка атрымаў менш за Ладуша

200 цэнтнэраў збожжа замест 100—дзяржаве

Калгас „Парастак Сацыялізму" здаў дзяржаве столькі збожжавых лішкаў, сколькі здаваў увесь сельсавет.

Абгаварэце посьпехі і недахопы калгасу

Посьпехі калгасу „Парастак Сацыялізму"—руйнуючы ўдар па кулацтве і яго правапартуністычнай агентуры. Прыбытак калгасьнікаў у чатыры разы большы за прыбытак адзінаасобнікаў. Разьмеркаваньне ўраджаю па колькасьці і якасьці працы выклікала новы прыліў у калгасы. Народжаны ў агні клясавага змаганьня „калгас Парастак Сацыялізму" бліскуча давёў адзінаасобнікам перавагу калектыўнай гаспадаркі

Калгасьнікі і адзінаасобнікі, шырока абмяркуйце вопыт разьмеркаваньня ўраджаю ў калгасе „Парастак Сацыялізму"

У агні народжаны

Калгас **«Перастак» сацыялізму»,** Рэчыцкага раёну, нарадзіўся ў агні абвостранага клясавага змаганьня. Мясцовае кулацтва ўсімі сіламі імкнулася разбурыць калгас. Клясавы вораг пайшоў на хітры манэўр. Яшчэ ўзімку 1928 году кулакі арганізаралі на былой абшарніцкай зямлі сваю кулацкую арцель. Кулацкі «калгас» праіснаваў нядоўга. Батракі і беднякі выкрылі хітрыкі клясавага ворага. Кулакі былі выгнаны з арцелі. На іх месца прыйшло некалькі бедняко ў якія на чале з камуністымі **Кацурай Цыбуком** і інш. стварылі калгас **«Чырвоны араты».** Увосень 1929 году «Чырвоны араты» аб'яднаўся з новым суседнім калгасам. Аб'яднанаму калгасу было дадзена імя — **«Парастак сацыялізму».**

Спачатку «Паростак сацыялізму» налічваў толькі 12 батрацка - бядняцкіх гаспадарак. Разьюшанае кулацтва прабавала з корням вырваць малады паростак. У ход былі пушчаны ўсе сродкі: агітацыя, хлусьня, паклёпы, адкрыты тэрор.

Але калектыўная праца паступова **перамагала.** Веснавая сяўба была праведзена па-бальшавіцку. **Плян веснавой пасеўнай кампаніі калгасьнікі перавыканалі на 11,5 проц.** Тады ў калгас **уступіла 35 новых бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.** Калгасьнікі дружна будавалі калектыўную гаспадарку.

Зараз калгас «Паростак сацыялізму» яднае **82** бядняцка - серадняцкія гаспадаркі. У калгасе **325** членаў: 185 працаздольных і 140 непрацаздольных. 80 проц. калгасьнікаў зьяўляюцца беднякамі і батракамі. Рэшта — малазаможныя сераднякі. Арцель мае **990** га зямлі. З іх 329 га пасеваў, 155 га сенажаці і рэшта — лес, выган і г. д. У калгасе ёсьць 35 га саду.

Уборачную кампанію калгас «Паростак сацыялізму» **канчае.** Ураджай ужо **ўбраны.**

Лічбы перамог

Гэтымі днямі калгасьнікі **першымі** ў Рэчыцкім раёне абгаварылі як разьмеркаваць свой ураджай і прыбыткі. На працягу чатырох дзён калгасьнікі знаёміліся з дырэктывамі партыі і ўраду па разьмеркаваньні ўраджаю. Потым, улічыўшы ўсе ўказаньні партыі і калгасных органаў, калгасьнікі арцелі «Паростак сацыялізму» на сваім апошнім сходзе 17 жніўня зацьвердзілі парадак разьмеркаваньня ўраджаю і прыбыткаў. Калгас аднадушна парашыў разьмяркоўваць ураджай **на аснове працоўнага прынцыпу.** Калгасьнікі ў сваіх выступленьнях **поўнасьцю ўхвалілі** ўсе ўказаньні НКЗ БССР і Белкалгасцэнтру.

Валавы даход калгасу дасягае лічбы, аб якой **ня марыў нават ні адзін калгасьнік.** Даход складае 67.098 рублёў. Варта адзначыць, што калгасьнікі пры падліках свайго ўраджаю ўзялі самыя мінімальныя плошчы. Па шмат якіх галінах разьмеркаваньня пры канчатковым разрахунку гэтыя лічбы будуць значна вышэйшымі.

Паляводства дало **33.556** руб.; гародніцтва — **11.883** руб.; садоўніцтва — **5.207** руб.; жывёлагадоўля — **9.807**; лугаводзтва — **5.886** руб. і іншыя крыніцы прыбытку — **739** руб.

Ураджай **на калгасных палёх высокі.** Ён значна **большы** за ўраджай індывідуальных серадняцкіх гаспадарак. Пасьля абмалоту асноўных збожжавых культур, калгасьнікі атрымалі з жавых культур, калгасьнікі атрымалі з аднаго га да **12,7** цэнтнэра. У адзінаасобнікаў-жа адзін гэктар, як правіла, не дае больш **5-6** цэнтнэраў.

Раней чым прыступіць да разьмеркаваньня ўраджаю, калгасьнікі вылучылі **5 проц.** фонд на абагуленую маемасьць **(2.514 руб.).** Гэтыя 5 проц. адлічаны з ураджаю і прыбыткаў ад абагуленай малочна - прадукцыйнай жывёлы. На кожны рубель абагуленай калгаснай маемасьці, такім чынам, прыпадае 23,94 кап. прыбытку.

Уборка ўраджаю

Як калгас разьмяркоўвае свае даходы

Вылучыўшы 5 проц. на абагуленую маемасьць, калгасьнікі з астатняй сумы **(64.574** руб.) зрабілі наступныя адлічэньні:

У насенны фонд, улічваючы **25**-процантнае павялічэньне засеўнае плошчы, калгас вылучыў **3.781** руб.; у страхавы насенны фонд — **378** руб; фуражны фонд **11.066** руб.; с.-г. падатак, страхоўка, крэдыты—**6.600** руб. У агульнай суме адлічэньні складаюць **22.055** рублёў.

Пасьля гэтых адлічэньняў, умоўна чысты прыбытак калгасу склаў **42.519** руб. **10 проц.** гэтае сумы калгасьнікі адлічылі ў непадзельны капітал; **2 проц.** —у культурна - бытавы фонд; **3 проц.** —на ўтрыманьне непрацаздольных і **1 проц.** на прэміяваньне лепшых калгасьнікаў і дапамогу школьнікам—дзецям членаў калгасу.

Калгас мае намер разьмеркаваць непрацаздольных на дальшае катэгорыі: першая катэгорыя — дзеці да **8**-мі год і другая катэгорыя — падросткі і старыя. Кожнаму непрацаздольнаму першай катэгорыі мяркуецца аказваць дапамогу ў **36** руб.; непрацаздольнаму другой катэгорыі — **72** руб.

3.000 руб. калгасьнікі адлічваюць на кватэрнае будаўніцтва. Такім чынам, пасьля ўсіх адлічэньняў для разьмеркаваньня сярод калгасьнікаў засталася сума ў **32.717** руб. **Яны разьмяркоўваюцца адпаведна колькасьці і якасьці працы, затрачанай кожным членам калгасу.**

Па колькасьці і якасьці

Яшчэ ў пачатку гаспадарчага году ў арцелі «Паростак сацыялізму» была ўведзена **шасьціразрадная тарыфная сетка. Тарыфікацыя і зьдзельшчына зьявіліся магутным стымулам уздыму прадукцыйнасьці працы і арганізацыйнага замацаваньня калгасаў.** Суадносіны паміж першым і шостым разрадам складаюць 1 : 2,3. Першы разрад атрымлівае **70** кап. і шосты — **1 р. 30 к.**

Вучот працы вядзецца па картачнай сыстэме. Кожны дзень у карту заносіцца колькасьць працы калгасьніка ў днёх і гадзінах. Усё гэта дало магчымасьць калгасу разьмяркоўваць ураджай аднаведна колькасьці і якасьці працы членаў арцелі.

Да канца гаспадарчага году калгасьнікі прапрацуюць, як паказваюць папярэднія падлікі, 21.988 працоўных дзён. На адзін працоўны дзень, прыпадае згодна ўведзенай тарыфікацыі 1 руб. 12 з палов. кап. На аплату ўсіх працоўных дзён, такім чынам, пайшло 24.671 руб. Рэшту (8.046 руб.) калгасьнікі параздалі таксама разьмяркоўваць на аснове працоўнага прынцыпу.

— Якая праца — такая і аплата, — аднадушна заявілі ўсе калгасьнікі. Больш працаваў — больш атрымаеш.

З гэтых 8.046 руб. на кожны зароблены рубель прышлося па 32 кап. Трэба ўлічваць, што шмат якія калгасьнікі маюць свае ўласныя гароды, даходы ад вывазкі лесу і г. д., што значна павялічвае прыбытак членаў калгасу.

Арытмэтыка, якая агітуе за калгас

Зараз ужо стала вядомым кожнаму калгасьніку, што дала калектыўная гаспадарка. Ніхто з іх не чакаў і не спадзяваўся, што калгас дасьць такія параўнальна вялікія прыбыткі. Калгасьнікі падлічылі, што раней, да арганізацыі арцелі «Паростак сацыялізму» прыбытак іх індывідуальных гаспадарак складаў агулам **15-17** тысяч. **А зараз прыбытак гэтых-жа гаспадарак, аб'яднаных у адзін калгас, складае 67.000 рублёў.** Гэта рэальная сапраўднасьць. Яна зрабіла вялікае ўражаньне ня толькі на адзінаасобнікаў, але і на самых калгасьнікаў. Паўтараем, члены калгасу «Паростак сацыялізму» у большасьці батракі і беднякі, часткова сераднякі. Пры ўступленьні ў калгас яны не абагулілі амаль ніякіх сродкаў вытворчасьці, бо іх ня было. І ўсё-ж калектыўная гаспадарка прынесла вынікі, якія **перакулілі** ўсе меркаваньні калгасьнікаў. Прыбытак членаў калгасу ў **чатыры разы большы за прыбытак індывідуальнікаў** Падалескага сельсавету, на тэрыторыі якога знаходзіцца арцель «Паростак сацыялізму».

Што-ж атрымае кожны калгасьнік? Адказ на гэта пытаньне дае наступная таблічка.

Прозьвішча калгасьнікаў	Колькі едакоў	Працаздольных	Усяго працоўных дзён	Сума прыбытку
Ладуш Ф.	2	2	375	697
Кішкарэнка	3	2	213	324
Савасьценка	1	1	300	488
Дубавец П.	4	4	882	1.335
Пац Ал.	2	2	387	687
Шпадарук Р.	7	3	684	947
Сівуха Л.	4	2	442	714
Невадвічанка Л.	3	2	448	708

Апрача гэтага, усе непрацаздольныя атрымаюць дапамогу са спэцыяльнага фонду, вылучанага калгасьнікамі.

Збожжавымі і іншымі прадуктамі калгасьнікі таксама забясьпечваюцца па прынцыпу працы, **затрачанай кожным калгасьнікам.**

Лепшая работа—большая аплата

Гэта таблічка выразна паказвае, што даход кожнага калгасьніка залежыць **выключна ад таго, які ўдзел прымаў ён у гаспадарцы. Перадавыя калгасьнікі, якія паказалі ўзор працоўнай дысцыпліны і добрасумленнай працы атрымліваюць больш за тых, якія неахайна, абыяк адносіліся да работы.** Вось, напрыклад, калгасьніца Дубавец Праскоўя, заўсёды добра працавала ў калгасе. Яна пасьпявала і дзіць кароў, і жаць жыта, і ўбіраць ураджай і г. д. Вось чаму прыбытак Праскоўі Дубавец складае 1.335 руб. Сумленна і добра працаваў і серадняк **Шпадарук Раман,** які атрымаў **940** руб. прыбытку. Батрак **Ладуш Тодар,** які прыкладна адносіўся да работы, атрымаў прыбытку —**697** руб. А вось **Кішкарэнка Аляксей** працаваў вусім **дрэнна.** Ён ледзь выпрацаваў 213 працоўных дзён. **Таму і прыбытак яго склаўся ўсяго 324 руб.**

Тым адзінкам, якія дрэнна працавалі, або ўнікалі ад работы, калгасьнікі рашуча на сходзе заявілі:

— Па рабоце і аплата. Калгас — не сабез.

Калгасьнікам, якія нядбайна, абыяк адносіліся да работы, калгас дае магчымасьць **выправіць сваю памылку.** Добрай работай на скансэньні ўборачнай кампаніі і правядзеньні асеньняй сяўбы гэтыя калгасьнікі могуць значна павялічыць свае прыбыткі.

100 і 200

— Усе лішкі здаць дзяржаве, — так аднадушна пастанавілі калгасьнікі на сваім агульным сходзе.

Выступаючы на сходзе, калгасьнікі падкрэсьлівалі, што дзяржава ім аказала вялікую дапамогу.

— Цяпер, у сваю чаргу, мы павінны выканаць свае абавязкі шляхам здачы збожжавых лішкаў. Першапачатковы плян здачы збожжавых лішкаў дзяржаве, прапанаваны праўленьнем, калгасьнікі павялічылі ў **два разы.**

— Замест 100 цэнтнэраў збожжа, вызначаных паводле пляну, — заявілі калгасьнікі, — дамо дзяржаве 200 цэнтнэраў.

Адну трэць валавога ўраджаю калгас здае дзяржаве. Гародніны калгас здае на **12.000** руб., бульбы — **2.000** цэнтнэраў. **У выніку калектыўнай работы калгасьнікі ў першым-жа годзе здаюць дзяржаве столькі збожжа, колькі здаваў летась увесь Падалескі сельсавет.** Раней кулакі, пасьля абмалоту ўраджаю, хавалі збожжа ў ямах, а потым прадавалі яго па ліхвярскіх цэнах падалескай беднаце. Цяпер падалескія батракі, беднякі і сераднякі - калгасьнікі пакрылі ўсё кулацкае вытворства хлеба, задаволілі ўсе свае патрэбы і здаюць пралетарскай дзяржаве столькі хлеба, колькі здаваў увесь сельсавет.

— Рабочыя нам значна дапамагаюць, —гаворыць калгасьнікі. На нашых палёх працавалі брыгады рабочых заводу **«Інтэрнацыянал»,** фабрыкі **«Дняпро»,** брыгада чырвонаармейцаў №-га артпалка і г. д. Мы адказваем ім сваёй калгаснай падзякай — **здачай аднэй трэцяй валавога ўраджаю дзяржаве.**

* * *

Разьмеркаваньне ўраджаю ў арцелі «Паростак сацыялізму» наглядна пераконвае адзінаасобнікаў падалескага сельсавету ў перавагах калектыўнае гаспадаркі. Невыпадкова, што ў часе разьмеркаваньня ўраджаю ў калгас **уступіла 8 новых бядняцка - серадняцкіх гаспадарак.** Ня сёньня-заўтра яшчэ шмат адзінаасобнікаў уступяць у калгас. Заўтрашні калгасьнік - адзінаасобнік становіцца сёньняшнім членам калгасу. Посьпехі арцелі «Паростак сацыялізму» нанесьлі руйнуючы ўдар кулацтву. Пацярпелі крах шалёныя прарокі ствы разьюшных кулакоў аб хуткім развале калгасу. Калгас расьце і мацнее. Толькі за першы год свайго існаваньня ён дабіўся таго, што прыбытак арцелі ў чатыры разы большы за прыбытак індывідуальных гаспадарак. Гэтыя посьпехі служаць парукаю далейшых перамог калгасу «Паростак сацыялізму».

Брыгада «Зьвязды» КУХАРКІН, САЛДАЦЕНКА.

Рэчыцкі раён,

калгас **«Паростак Сацыялізму»**

Жнівень, 1930 год.

Партыйнае будаўніцтва

Мацней удар па праваапартуністычнай практыцы!

„У пэрыяд разгорнутага па ўсім фронце наступленьня на капіталістычныя элемэнты правы ўхіл быў і застаецца галоўнай небясьпекай у партыі"

(З рэзалюцыі XVI зьезду)

Усе сілы на выкарчоўваньне спадчыны праваапартуністычнага кіраўніцтва

«Зьвязда» ў допісе «Кулаку на выгаду», які зьмешчаны 3-га жніўня г. г., падавала рад фактаў з праваапартуністычнай практыкі парткіраўніцтва **Чарэйскай райпартарганізацыі.** У гэтым допісе на канкрэтных прыкладах паказана, што раённае парткіраўніцтва скаціўшыся да апартунізму ўсе надзеі на далейшым разгортваньні калектывізацыі ўскладала на самацёк, зусім не давала адпору разьюшанаму кулацтву, якое сваю антысавецкую дзейнасьць накіравала на разбурэньне калгасаў, на падрыў уборачнай кампаніі.

У гэтым допісе «Зьвязда» патрабавала неадкладнага і поўнага абнаўленьня парткіраўніцтва Чарэйскай арганізацыі. Аднак, гэта абнаўленьне адбылося не ў выстарчальнай ступені. Рад канкрэтных фактаў паказвае, што партыйныя масы яшчэ поўнасьцю не мабілізаваны на выкарчоўваньне праваапартуністычнае практыкі. Не мабілізаваны на выкананьне задачы па гаспадарчым замацаваньні калгасаў, на правядзеньне важнейшых палітычных кампаній.

Да ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі партыйныя арганізацыі і раённыя ўстановы **не падрыхтаваны,** калі ня лічыць таго, што райза склаў плян і вынес на абмеркаваньне 4-х куставых сходаў. Гэтыя пляны непасрэдна да калгасаў не даведзены.

Уборка ўраджаю адбываецца самацёкам. Плянаў ня было. У калгасах яшчэ не прыступілі да абмеркаваньня пытаньня разьмеркаваньня ўраджаю. Райпаляводсаюз не пакланацыўся аб забясьпячэньні калгасаў сельска-гаспадарчымі машынамі і прыладамі, таму ў час уборкі ўраджаю ў калгасах адчувалася патрэбнасьць у сярпох, косах і іншым с.-г. інвэнтары. Характэрна падкрэсьліць што ў самы разгар уборачнай кампаніі райвыканком даў аграномам водпускі.

Амаль ва ўсіх калгасах раёну праца не арганізавана, норм выпрацоўкі зьдзельных расцэнак няма. Іх нават не ўяўляюць калгасьнікі. Як правіла ў калгасах заведзены такі парадак: на якойбы рабоце і як-бы калгасьнік не працаваў, усёроўна запісваецца дзень. У большасьці калгасаў не наладжана рахункаводзтва.

Будаўніцтва па калгасах **сарвана.** У раёне няма плыну, што і ў якім калгасе будаваць. Адпушчаны лесаматар'ял на суму 8.000 руб. па калгасах не разьмеркаваны і ня вывезены. 30.000 руб. крэдыту вызначанага на будаўніцтва ў калгасах на бягучы 1929-30 гаспадарчы год не скарыстаны. Між тым, калгасы маюць пільную патрэбу ў складачных памяшканьнях. Нічога ня зроблена ў калгасах для пабудовы сілосных вежаў і ям. Тое-ж самае і з будаўніцтвам сьвінарнікаў.

У раёне шмат інтэрнацыянальных па сваім складзе калгасаў, у якіх мелі месца антысэміцкія і шавіністычныя вылазкі. Між тым, партыйныя ячэйкі не рэагуюць на гэтыя рознага роду праявы шавіністычных настрояў, не праводзяць інтэрнацыянальнага выхаваньня. У калгасе «Колас» меў месца факт антысэміцкай вылазкі з боку жанчын-беларусак, а ячэйка на яго не рэагавала.

Усе гэтыя факты гаворыць пра тое, што раённае кіраўніцтва не спраўляецца з задачамі, пастаўленымі па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. Раённае кіраўніцтва **абноўлена не ў выстарчальнай ступені.** Новы сакратар РК КП(б)Б узяўся за работу па выкарчоўваньні спадчыны і праваапартуністычнай практыкі мінулага складу кіруючых работнікаў райкому. Аднак ён не атрымлівае належнай дапамогі з боку раённага партактыву.

Чарэйская рэпартарганізацыя павінна даць адпор тым, хто скажае партыйную лінію, павінна мабілізаваць усю партыйную масу на барацьбу за генэральную лінію партыі, за поўнае ажыцьцяўленьне пастаноў XVI зьезду.

Таганові ч.

Нэпманы у пашане Лагойскіх камуністых

«Далейшае пасьпяховае разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва ставіць зараз з асаблівай сілай перад ЦКК-РСІ задачу рашучай барацьбы за ачышчэньне і аздаравленьне дзяржаўнага і гаспадарчага апарату, за стварэньне ў ім умоў, якія выключалі магчымасьць шкодніцтва і іншых праяў кулацка-нэпманскага ўплыву». Гэтай задачы, якая пастаўлена XVI зьездам УсеКП(б) ня толькі перад ЦКК-РСІ, але і перад усёй партыяй у **Лагойскай партарганізацыі** асобныя яе кіраўнікі не ўсьвядомілі. Што гэта менавіта так, можна паказаць на радзе канкрэтных прыкладаў.

Былыя гандляры і спэкулянты пралезьлі на работу ў каапэрацыйныя і гаспадарчыя арганізацыі і цягнуць за сабою ўсё новыя і новыя клясава-варожыя нэпманскія элемэнты ў дзяржаўны і каапэрацыйны апарат.

Падамо канкрэтныя факты. Учарайшы гандляр кораньмі Каган Шолам, гандляр скацінай Зэлькінд Хаім працуюць у каапэрацыі. Таксама працуюць у каапэрацыйных аб'яднаньнях былы рабін Файн, былы скупшчык скацінны Шымайовіч. Сьпіс гэтых былых гандляроў, якія пралезьлі ў каапэрацыю, можнабыло-б памножыць. Яны нейкім парадкам атрымалі права выбарчага голасу і запраўляюць каапэрацыйным апаратам.

Лагойская парт'ячэйка, добра ведаючы аб усіх гэтых фактах, **ня прымае ніякіх мер,** каб аздаравіць апарат каапэрацыі, каб папярэдзіць гэта недапушчальнае зьявішча.

Сацыяльна-варожыя элемэнты пралезьлі і ў калгасы. У калгас «Бальшавік» пралез Горшман Шмэрка, які да рэвалюцыі меў вялікую краму і экспляатаваў гадамі па некалькі батракоў. Пры савецкай уладзе Горшман арандаваў буйныя сады, скупляў збожжа, меў сваю маслабойку і трымаў па некалькі пастаянных наёмных рабочых. Аднак і гэта не пашкодзіла яму быць «калгасьнікам». Між іншым, ён у калгасе фізычна не працуе, а выконвае абавязкі наглядчыка над калгасным садам. Калі калгасьнікі—актывісты т. Пальчэўскі, які адзін з першых уступіў у калгас, выказаў думку аб тым, што Горшману ў калгасе ня месца, дык гэтага актывістага выключылі з арцелі. Праўленьне дапусьціла грубыя скажэньні партыйнае лініі. Гэтым самым яно душыць самакрытыку, разьвязвае рукі сацыяльна-варожым элемэнтам.

Мы ставім пытаньне: дзе была партыйная ячэйка, дзе былі раённыя ўстановы?

Няўжо яны лічаць усе такія зьявішчы нарм

Ударнікі „БЕЛАРУСКІ“ будуюць „сустрэчны прамфінплян“

Апартуністыя тармозяць разьвіцьцё рабочай ініцыятывы

Першыя перамогі

Жнівень пачаўся поўным выкананьнем праграмы

Нярэальныя кантрольныя лічбы абвергнуты выяўленьнем рэальных скрытых рэсурсаў.

МАЙСТРЫ ІЛЬЛІН І РАМАНОЎСКІ СУПРОЦЬ БАЛЬШАВІЦКІХ ТЭМПАЎ

Ударнікі фабрыкі «Беларуска», якія прынялі актыўны ўдзел у складаньні сустрэчнага прамфінпляну. ЗЬЛЕВА НАПРАВА: т. т. ВАРЭНІКАЎ, які ўнёс 5 прапаноў, БАГІНСКІ — 14 прапаноў, ГОТЛІБ — 6 прапаноў, ЛЫСАКОЎСКІ —2 прапановы, БЕЛЕНЬКІ — 4 прапановы, ЛЫЧКОЎСКІ і МАМІС — пепшыя рабочыя, ШЫДЛОЎСКІ — 5 прапаноў, ЛЕВІДАЎ — 1 прапанову і МАКАРЭВІЧ — дзьве прапановы.

Шлях актывістых

Ударнікі цэлюлёідна-галалітавай фабрыкі «Беларуска» пачынаюць падводзіць першыя вынікі складаньня «сустрэчнага прамфінпляну».

Па сёньняшні дзень паступіла каля 85 прапаноў аб тых ці іншых паляпшэньнях і ўдасканаленьнях вытворчасьці. Ёсьць прапановы, якія прынясуць тысячы руб. эканомі. Рабочы **Багінскі** за два тыдні даў 14 каштоўных прапаноў: з іх найбольш важныя —аб больш эканомным карыстаньні цынку, лепшым скарыстаньні машын і, наогул, аб работе ўсяго аддзяленьня па вырабе палатняных гузікаў. Рабочы **Варэньнікаў** унёс пяць прапаноў. Работніца **Готліб** — **6 прапаноў і г. д.** Збор прапаноў працягваецца. Кожны дзень «кішэні» фабрычнай дошкі запаўняюцца ўсё новымі і новымі прапановамі.

15 брыгад, якія ахапляюць 85 рабочых, падрабязна вывучаюць усе працэсы работы. Брыгады правялі вялікую работу па выяўленьні вытворчых магчымасьцяй варштатаў, машын і цэхаў. Адначасова, брыгады выяўляюць усе недахопы і тут-жа намячаюць практычныя мерапрыемствы для іх зьнішчэньня. Гэтыя брыгады зьбіраюцца штодзенна і падводзяць вынікі зробленага за дзень. Свае прапановы брыгады перадаюць цэхавым камісіям. Апрача цэхавых камісій па цэхах створаны **групы садзейнічаньня** з ударнікаў-добраахвотнікаў, у абавязкі якіх уваходзіць кантроль за выкананьнем рабочых прапаноў, практычная дапамога адміністрацыі ў выкананьні гэтых прапаноў, а таксама дапамога адміністрацыі ў падрыхтоўцы да новага гаспадарчага году.

50.000 рублёў прыбытку

Прапрацоўваючы кантрольныя лічбы, рабочыя брыгады знайшлі, што лічбы ўзяты са столі і зьяўляюцца далёка нерэальнымі. Вось прыклады.

Для дублярнага аддзяленьня, прадукцыйнасьць якога ўзята за аснову прадукцыйнасьці ўсяго цэху па вырабе трэбняў, кантрольныя лічбы намячаюць па 3.000 трэбняў на кожную машыну штодзенна. Між тым, рабочая брыгада выявіла, што сярэдняй кваліфікацыі рабочы **ўжо цяпер** выпрацоўвае значна больш, прычым некаторыя рабочыя даюць больш, чым на 25 проц. Напрыклад, рабочы **Коўшык** дае ў сярэднім 4.000 гладкіх трэбняў, рабочы **Беленькі** — 3.464, рабочы **Залівайка** — 3.940, работніца **Тасьман** —4024 і г. д. Выходзячы з гэтага, рабочая брыгада па выпрацоўцы «сустрэчнага прамфінпляну» **разам з рабочымі дублярнага аддзяленьня** высунулі сустрэчную кантрольную лічбу ў 3856 трэбняў у дзень на кожную машыну.

Такі-ж малюнак выявіўся і па інш. аддзяленьнях. У закройным аддзяленьні кантрольная лічба ў 9.000 трэбняў павялічана рабочымі да 12.000 трэбняў у дзень.

На наклейцы кантрольная лічба ў 2.000 трэбняў павялічана да 2,700, на раскройцы трэбняў кантрольная лічба павялічана рабочымі на 44 проц., па штампоўцы — на 59 проц. і г. д. А калі-б у дублярным аддзяленьні, якое зьяўляецца «вузкім месцам» на фабрыцы, можна было-б спачатку трэцягоду пяцігодкі паставіць яшчэ 5 шліфавальных колаў (якія можна зрабіць уласнымі сродкамі), дык кантрольныя лічбы па цэху трэбняў можна было-б павялічыць з 77.000 соцен да 100.000 соцен. Але паколькі ў дублярным аддзяленьні няма месца і дадатковыя шліфавальныя колы можна будзе паставіць не раней пачатку другога паўгодзьдзя, рабочыя брыгады павялічылі кантрольную лічбу з 77.000 соцен да 81.000 соцен трэбняў. Гэтае павялічэньне на 5,2 проц. дасьць дадатковa прадукцыі на 130.000 руб. і **прыбытку 50.000 руб.**

Камсамолец ФІШБЕЙН, старшыня вытворчага сэктару фабкому фабрыкі «Беларуска» — арганізатар «сустрэчнага прамфінпляну».

„Сустрэчныя“ якасныя паказальнікі

Цэх па вырабе гузікаў не адстае. Асноўнае аддзяленьне — рэзка гузікаў — павялічыла кантрольныя лічбы на 27 проц., фасаніровачнае аддзяленьне— на 30 проц., сартыровачнае аддзяленьне высунула «сустрэчны прамфінплян» у 17.000 гузікаў на адну работніцу ў дзень замест 12.400 паводле кантрольных лічбаў, сартыроўка пэрлямутравых гузікаў павялічыла кантрольныя лічбы з 5.485 шт. да 10.000 шт. Наогул і гэтым цэху «сустрэчны прамфінплян» значна павялічыць прадукцыйнасьць.

Але рабочыя брыгады высоўваюць ня толькі «сустрэчны прамфінплян» па колькасных паказальніках, іх таксама цікавяць якасныя паказальнікі. Паколькі нельга зараз пашырыць дублярнае аддзяленьне цэху па вырабе трэбняў, рабочыя брыгады прапануюць толькі ў двух аддзяленьнях — шліфавальным і часткова ў закройным —пакінуць трох зьменную работу, а ў іншых аддзяленьнях працаваць у дзьве зьмены. Даючы магчымасьць выканаць праграму ў 81.000 соцен трэбняў, гэтая прапанова з'эканоміць значную суму грошай і зьніз сабекошт прадукцыі звыш лічбы, прадугледжанай новым прамфінплянам.

Майстры спалохаліся

«Сустрэчны прамфінплян» застаў некаторых кіраўнікоў фабрык зьнянацку. Асабліва спалохаўся майстар **Раманоўскі.** Ён рэзка выступіў ня толькі супроць «сустрэчнага прамфінпляну», але нават супроць кантрольнай лічбы на дублярным аддзяленьні ў 3.000 шт. «Разарвецеся, а не выканаеце, —крычаў ён рабочым,—давайце лепш зьменшым гэтую лічбу».

На вытворчай нарадзе цэху па вырабе трэбняў выступіў майстар **Ільпін,** ён-жа член бюро парт'ячэйкі і абвінаваціў рабочых брыгады ў тым, што яны не разумеюць, што такое «сустрэчны прамфінплян». Сам ён выступіў супроць «сустрэчнага прамфінпляну», матывуючы тым, што «ніколі нічога нельга прадугледзець, што часамі награваецца падшыпнік, або лопне пружына ў дублярнай машыне, што мы тады будзем рабіць?» Выступленьне майстра Ільліна паказала, што ён сапраўды мала разьбіраецца ў «сустрэчным прамфінпляне» і не азнаёміўся з кантрольнымі лічбамі. Бо рабочыя брыгады, як і кантрольныя лічбы, выходзілі з разрахунку **296 рабочых дзён** на працягу году, улічваючы чарговыя водпускі, рамонт машын і магчымыя прастоі.

Ільіна падтрымаў памоцнік мастра гэтага-ж цэху **Батвіньнік,** які, дарэчы, зараз замяшчае сакратара ячэйкі КП(б)Б. Пачаў ён сваю прамову тым, што рабочыя брыгады **«добра пяюць сапаўямі»,** што лічбы «сустрэчнага прамфінпляну» ня будуць выкананы, бо «мы ня здолеем падрыхтаваць патрэбныя кадры рабочых», забываючы, што ўсяго трэба падрыхтаваць 11 рабочых.

Ячэйка—у баку

Такім чынам, якраз два члены партыі выступілі супроць «сустрэчнага прамфінпляну». На жаль, яны не атрымалі належнага адпору ад ячэйкі. Партыйная ячэйка аказалася ў баку ад гэтай справы. Замест актыўнага кіраўніцтва, бюро парт'ячэйкі абмежавалася вылучэньнем некаторых партыйцаў для ўдзелу ў рабочых брыгадах па складаньні «сустрэчнага прамфінпляну» і не пацікавілася праверыць, як гэтыя таварышы выконваюць заданьне бюро. Некаторыя з гэтых таварышоў паехалі з Менску, а бюро ячэйкі ня вылучыла іншых таварышоў.

Толькі ў апошнія дні майстры Батвіньнік і Ільлін зразумелі сваю памылку і прызналі, што лічбы «сустрэчнага прамфінпляну» зусім рэальны.

Да большых перамог!

Дзякуючы «сустрэчнаму прамфінпляну» на фабрыцы ўжо наглядаецца значны пералом у рабоце. Калі за апошнюю 10-ціднёўку ліпеня вытворчая праграма была выканана на 82,3 проц., дык у першую 10-ціднёўку жніўня, у часе складаньня «сустрэчнага прамфінпляну», праграма выканана **на 97,4 проц.,** прычым цэх па вырабе трэбняў выканаў праграму на 133 проц. замест 106,6 за апошнюю дзесяціднёўку ліпеня.

Гэтыя перамогі даюць упэўненасьць у тым, што энтузіязм і ініцыятыва ўдарнікаў фабрыкі «Беларуска» дапамогуць фабрыцы ня толькі ліквідаваць прарыў бягучага году, але на базе пабудовы «сустрэчнага прамфінпляну» дабіцца яшчэ большых перамог на вытворчым фронце.

М. Ц.

Усебеларуская выстаўка

КАДРЫ ТЛУМАЧОЎ НЕ ПАДАБРАНЫ

Зьнішчым ігнараваньне беларускай мовы, „высокі стыль“, абеглыя, непрадуманыя тлумачэньні

Першая дэкада Ўсебеларускай выстаўкі надта выразна, мовай фактаў, даводзіць, што з боку значнай часткі тлумачоў і групаводаў мы маем абыякавыя, лёгкія і павярхоўныя адносіны да сваёй работы.

У той-жа час зусім зразумела, што тлумачы пастаўлены ў павільёнах не для ездобы, не як дармовы дадатак, а як практычныя кіраўнікі экскурсій, як пэўныя выхаваўцы.

Спазьненьні тлумачоў уваходзяць у правіла. Былі, напрыклад, дні, калі павільёны — друку, МОПР'у і інш. адчыняліся толькі а палове 11 гадзіны. А паводле ўстаноўленага распарадку яны павінны адчыняцца а 9 гадзіне.

Але самае горшае — гэта канкрэтныя тлумачэньні ў павільёнах.

Мы задаліся мэтаю на працягу дзьвюх гадзін абыйсьці галоўнейшыя павільёны, каб высьветліць «на ходу», як спраўляюцца тлумачы з ускладзенымі на іх абавязкамі.

Што-ж паказаў абход?

У павільёне электрыфікацыі і машынізацыі сельскае гаспадаркі тлумачы ўжываюць выключна навуковую тэрміналёгію: «токі высокае напружанасьці», «акумулятарныя калёсы», «выключацель у масьле», «шчоткі ў колах», — а што да чаго і чаму — вы не даведаецеся...

У павільёне ніжэйшых экспанатаў па жывёлагадоўлі — ня лепей. «Праблемы бактэрыялёгіі», «лябараторныя мэтады»... І экскурсанты - калгасьнікі моўчкі стаяць, канчаткова падаўленыя «вучонасьцю» тлумача.

Далёка невыстарчальная, каб не сказаць больш рэзка, якасьць тлумачэньняў і ў павільёне друку.

— «Вось біблія, вось палітычная літаратура, яе вы знойдзеце ў кожнай школе, — вось розныя тэорыі (на шчыце кніга Бухарына: «Тэорыя гістарычнага матэрыялізму»), а вось Ленін на беларускай мове. — можа хто-небудзь з вас чытаў...»

Пра значэньне і буйны рост нашага бальшавіцкага друку — а ні слова. Тлумач ня ведае нават, дзе можна падпісацца на творы Леніна.

У павільёне каапэрацыі тлумачы надта захапляюцца лічбамі, пераказваюць відавочны зьмест дыяграм і «галёнам» скачуць па макетах.

На экспанатах мэтэаралёгічнай станцыі няма ніякіх надпісаў. Прызначэньне яе наогул зьяўляецца патаемнасьцю для экскурсантаў, патаемнасьцю, што сурова захоўваецца яе кіраўнікамі.

— «Гэтая будка павінна адчыняцца з поўначы (а чаму?); тутака гіброграф і тэрмограф: апошні пабудаваны па прынцыпе розьніцы каэфіцыэнтаў дзьвюх пласьцінак. Вось машына, што вырабляецца толькі за мяжой».

І кропка...

«Зьвязда» зазначала ўжо між іншым, што ў некаторых павільёнах цяжка начуць ад тлумачоў і гуртаводаў беларускую гаворку. А тым ня менш на сёньняшні дзень гэтая справа мала чым палепшылася.

Трэба даваць нашаму экскурсанту кароткія, але выразныя і зразумелыя тлумачэньні. Інакш у вялікай меры траціцца самы сэнс наведваньня выстаўкі.

Юр. ЛЯВОННЫ.

Пазыка „Пяцігодка—за 4 гады

БУЙНЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ МЕНСКУ АДСТАЮЦЬ

Да 1-га верасьня ахапіць пазыкай двухтыднёвы заработак рабочых і служачых

Тэмп рэалізацыі нездавальняючы

ПРАФАРГАНІЗАЦЫІ НЕ ДАБІЛІСЯ ЯШЧЭ ПАГАЛОЎНАГА АХОПУ РАБОЧЫХ

Праверка ўдзелу прафарганізацый у рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка — за чатыры гады» выявіла няўважлівыя адносіны прафсаюзаў да гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі.

ЦП ШВЭЙНІКАЎ НЯ МАЕ ВЕСТАК

Возьмем, напрыклад, саюз **швэйнікаў.** ЦП саюзу ня кіруе кампаніяй рэалізацыі. ЦП зусім ня ведае аб тым, як ідзе падпіска па 4-х буйных прадпрыемствах. Ёсьць весткі толькі па 3-х прадпрыемствах і то няправільныя.

На фабрыцы «Кастрычнік», якая налічвае 2.060 чал., паводле даных саюзу, працуе 1.600 рабочых. Рабочыя фабрыкі ахоплены падпіскай толькі на 67%.

ТОЛЬКІ 71% ГАРБАРОЎ ПАДПІСАЛІСЯ НА ПАЗЫКУ

Дрэнна праходзіць кампанія рэалізацыі пазыкі на прадпрыемствах **гарбарнай прамысловасьці.** Самыя буйныя фабрыкі плятуцца ў хвасьце. ЦП саюзу пра гэта добра ведае, але ніякіх мер ня прымае. На 15-га жніўня падпіска сярод рабочых і служачых складае 83% двухтыднёвага заработку, толькі 71% **рабочых** ахоплены падпіскай.

Наз аводзе «Бальшавік» з 863 рабочых ахоплена падпіскай 557. Сума чадпіскі раўняецца 65 проц. двухтыднёвага заработку.

На абутковай фабрыцы пры 920 рабочых падпісаліся 575, або 62 проц., на 84 проц. двухтыднёвага заработку. На рымарнай фабрыцы з 227 рабочых ахоплена 155 чал., на 84 проц. заработнае платы.

МЭТАЛІСТЫЯ АДСТАЮЦЬ

Нездавальняюча ідзе рэалізацыя пазыкі і сярод **рабочых мэталюргічнае прамысловасьці.** На 10 жніўня падпіскай па прадпрыемствах, якія абслугоўваюцца саюзам мэталістых, ахоплена толькі 77 проц. рабочых на 97 проц. заработнае платы.

На заводзе «Энэргія» падпісалася толькі 77 проц. рабочых на суму звыш 40 тыс. рублёў, што складае 83 проц. двухтыднёвага заработку. На Эльводзе з 323-х рабочых падпісалася 247, або 70 проц. на агульную суму 13 тыс. руб.

Рабочыя заводу «Камунар» ахоплены падпіскай на 80 проц., завод «Адраджэньне» — на 56 проц. Прафсыянальныя арганізацыі мала што зрабілі, каб дабіцца поўнага ахопу рабочых-мэталістых пазыкай.

БЕЗ КІРАЎНІЦТВА САЮЗУ

ЦП саюзу **хэмікаў** ня мае дакладных вестак аб ходзе рэалізацыі пазыкі па прадпрыемствах і таму, зразумела, ня можа кіраваць кампаніяй. ЦП зусім ня ведае, як ідзе падпіска на заводзе «Чыр воны Хэмік». На гуце «Пралетары» ахоплена падпіскай толькі 70 проц. рабочых на суму 8.400 руб. — 72 проц. двухтыднёвага заработку. Мясцком навукова-дасьледчага інстытуту прамысловасьці зусім бязьдзейнічаў, у выніку па інстытуце падпісалася толькі 59% служачых.

Усяго на 15 жніўня па ўсім саюзе хімікаў ахоплена падпіскай **76 проц. рабочых** на 86 проц. двухтыднёвага заработку.

ЭНТУЗІЯЗМ ПРАЦОЎНЫХ НЕ ПАДХОПЛЕНЫ

Не разгарнуў работы па рэалізацыі пазыкі і **саюз працаўнікоў зямлі і лесу.** Той факт, што ахоплена 69 проц. рабочых і служачых па Менску на 130% двухтыднёвага заработку, гаворыць аб тым, што энтузіязм працоўных ня быў замацаваны, ня быў падхоплены прафесыянальнымі арганізацыямі і ніякімі камсадамі. У Белпаляводсаюзе ахоплена падпіскай толькі 55 проц. служачых, Белмалжывсаюзе толькі 6 проц.

НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫЯ ВЫНІКІ ПА РАДЗЕ САЮЗАЎ

Нездавальняючыя вынікі кампаніі рэалізацыі па **саюзе саўгандальслужачых** Згодна апошніх вестак саюзу, падпіскай ахоплена 60 проц. служачых, на агульную суму 80 проц. двухтыднёвага заработку.

Нядаўна мы адзначылі безадказныя нядбайныя адносіны **групкому МЦРК** да кампаніі рэалізацыі. Аб выніках гэтай нядбайнасьці сьведчаць наступныя лічбы: у групкоме № 1 з 600 служачых падпісалася 294 — 40 проц., у групкоме № 4 падпісалася 25 проц., у групкоме № 5 — 34 проц.

Ня лепш ідзе работа па **саюзе мэдсанпрацы.** На 15 жніўня па гэтым саюзе ахоплена падпіскай 59½ проц. рабочых і служачых на агульную суму 5[illegible] тыс. руб., што складае 83 проц. двухтыднёвага заработку. У мясцкоме № 1 саюзу з 260 служачых падпісалася толькі 101, у групкоме № 11 з 252 падпісалася 127, у мясцкоме № 6 з 145 — 8[illegible] і г. д.

Па саюзе будаўнікоў з 10 тыс. рабочых падпісалася, паводле даных на 1[illegible] жніўня, 4.800 чал. — 48 проц. агульнага ліку на суму 226 тыс. рублёў.

На **саюзе працаўнікоў мастацтва** 415 чалавек падпісалася 301, або 72% Падпіска складае 87 проц. двухтыднёвага заработку. Рэалізаваныя сумы неаформлены, бо, як заявілі ў саюзе «установы чакаюць прыходу адпускнікоў, каб разгарнуць далейшую падпіску».

У гаркоме адзіночак падпіскай ахоплена толькі 42 проц. працаўнікоў.

У ПЕРШЫХ РАДОХ — ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫКІ І КАМУНАЛЬНІКІ

Параўнальна з іншымі саюзамі, добра ідзе рэалізацыя пазыкі па саюзе **рабочых дрэвааапрацоўчай прамысловасьці.** Пазыкай ахоплена 90 проц. рабочых на агульную суму 52.320 руб. што складае каля 104 проц. двухтыднёвага заработку.

Лепш чым ва ўсіх іншых саюзах праходзіць кампанія і сярод **рабочых камунальнае гаспадаркі.** На 15 жніўня, па саюзе камунальнікаў ахоплена падпіскай 90 проц. усіх працаўнікоў на агульную суму падпіскі 54.000 руб., або 97,[illegible] проц. двухтыднёвага заработку.

Наперадзе ўсіх ідзе атрад **трубачыстых,** дзе ўсе рабочыя ахоплены падпіскай, дзе агульная сума падпіскі складае 127 проц. двухтыднёвага заработку.

ЦСПСБ павінен прыняць самыя рашучыя меры да актывізацыі работы прафсаюзных арганізацый у адносінах пазыкі. Трэба дакладна праверыць удзел прафарганізацый у падпісной кампаніі і рашуча ўдарыць па тых, хто лічыць, што рэалізацыя пазыкі — ня справа прафсаюзных арганізацый, хто, замест актыўнага ўдзелу і кіраўніцтва работай, пляцецца ў хвасьце мас і спадзяецца на самацёк.

БІРШТЭЙН.

У коле бязьдзейнасьці і безадказнасьці

Раённыя партыйныя арганізацыі! Памятайце, што вы адказваеце за пасьпяховы ход загатовак мяса і гародніны

ЗА ПЕРШУЮ ДЭКАДУ ЖНІЎНЯ ПЛЯН МЯСАЗАГАТОВАК ВЫКАНАНЫ НА 2,8%

МЦРК САРВАЎ ДАСТАЎКУ БУЛЬБЫ Ў МЕНСК

Да суровай адказнасьці вінаватых у перабоях па забесьпячэньні рабочых цэнтраў

Работу каапэрацыі і загатоўчых арганізацый—пад пільны кантроль пралетарскай грамадзкасьці

2,8 проц.

За ліпень месяц плян мясазагатовак выканан на 51 проц., а за першую дэкаду жніўня—на 2,8 проц. Па асобных акругах загатоўкі ідуць яшчэ горш. Па Вабрўйскай акрузе плян выканан на 0,2 проц., Магілеўскай 1,4 проц., Мазырскай—0,6 проц., Менскай—1,2 проц.

Такі тэмп мясазагатовак сьведчыць аб тым, што загатоўчыя арганізацыі, раённыя камітэты партыі і райвыканкомы дрэнна разгарнулі сваю работу вакол выкананьня важнейшага заданьня

Акруговыя загатоўчыя арганізацыі, у сувязі з ліквідацыяй акруг, зусім перасталі зьвяртаць увагу на ўзмацненьне мясазагатовак.

Белкаапсаюз і Белмалжывсаюз, якія зьяўляюцца асноўнымі загатоўчымі арганізацыямі ў БССР, да гэтага часу яшчэ ня далі адпаведных паказаньняў нізоўцы аб неабходнасьці і важнасьці поўнага выкананьня плянаў мясазагатовак.

Вялікай перашкодай зьяўляецца няправільнае разьмеркаваньне вылучаных фондаў па прэміяваньні здатчыкаў мяса. Ёсьць цэлы рад фактаў, калі выкананьне плянаў зрываецца з-за адсутнасьці патрэбных прамтавараў, ня гледзячы на тое, што яны вылучаны.

Зрываюць загатоўкі мяса спэкулянты, якія павышаюць цэны. Мясцовыя арганізацыі не вядуць з імі патрэбнай барацьбы. Пад выглядам сялян спэкулянты скупляюць скаціну, забіваюць яе і прадаюць на рынку па павышаных цэнах. Патаемны ўбой жывёлы зноў павялічыўся. Мясцовыя адміністрацыйныя органы паслабілі сваю ўвагу на гэтым вучастку.

Дырэктывы партыі аб эканоміі мяса не праводзяцца ў жыцьцё. Цэлы рад абсьледваньняў рабочых брыгад паказвае аб тым, што месцы значна перавышаюць вылучаныя для іх фонды мяса. Белмясам перададзены пракуратуры рад спраў для прыцягненьня да адказнасьці раёнаў, якія перавышаюць вызначаныя фонды мяса.

Выкананьне пляну мясазагатовак зьяўляецца аднэй з галоўнейшых задач сёньняшняга дня. Партыйныя, савецкія і загатоўчыя арганізацыі павінны мабілізаваць усю грамадзкую думку вакол мясазагатовак.

АРК.

На мясазагатоўкі не зварачаюць увагі

У ліпені віцебскі спажывецкі саюз павінен быў загатовіць 109,2 тоны мяса, а нарыхтаваў толькі 15 тон, страціўшы на гэта больш паловы прэміяльнага фонду. Ня лепш і ў акрмалжывсаюзе, які, замест вызначаных 72 тон, даў толькі 22. Такім чынам, забесьпячэньне віцебскіх рабочых мясам па мінімальнай норме зрываецца.

Пры папярэднім азнаямленьні выяўляецца, што спажывецкая каапэрацыя і жывёлагадоўчы саюз увесь мінулы месяц рыхтаваліся да ліквідацыі.

З 1-га жніўня акруговы малочны саюз ліквідаваўся і паслаў усім раённым т-вам аднолькавую дырэктыву: «Трымайце сувязь з Менскам». Гэта ўсё, што зрабіла акруговае аддзяленьне для замацаваньня раённых арганізацый.

Раённыя арганізацыі зараз заняты падборам штатаў, на загатоўкі зварачаюць мала ўвагі. Бешанковіцкі раён павінен быў за палову жніўня здаць 8 тон мяса, ня здаў ні аднаго кілё, Віцебскі раён павінен быў здаць 21 тону, таксама нічога ня здаў. Ня лепш абстаіць справа і ў іншых раёнах.

ЦСПСБ тры тыдні таму назад прапанаваў Віцебскаму акрпрафсавету вылучыць з рабочых ударнікаў, якія-б праверылі ход мясанарыхтовак, работу Белмяса, Белрыбы, малочнага саюзу. Але акрпрафсавет да гэтага часу ня вылучыў ні аднаго таварыша.

Брыгадзір «Зьвязды»

КАВАЛЕЎ.

Гінуць дзесяткі тысяч пудоў фруктаў,

а ў крамах ЦРК ніводнага кілё

Саўгасы і калгасы Барысаўскага раёну маюць больш 500 гэкт. саду, большасьць садоў бясплётуньных.

Саўгасы **Весянова** і **Серкпутова** маюць больш, як 10 гэкт. саду, але спажывецкай каапэрацыі **не здалі ні аднаго кілёгр. фруктаў.** Калгасы **«Чырвоны Гай», «Пралетарская Перамога», «Камсамолец»** і **«Чырвоная Зьмена»,** Зэмбінскага сельсавету таксама маюць некалькі дзесяткаў гэктараў садоў. Калгас **«Чырвоны Гай»** здаў толькі 10 пуд. фруктаў. Другія калгасы ўсё паядаюць самі.

— Нам няма зусім ніякага рахунку прадаваць яблыкі. Няхай лепш зьядзе жывёла.

Так заяўляюць кіраўнікі гэтых калгасаў.

Барысаўскі ЦРК сваячасова не падумаў, каб закантрактаваць фрукты і зараз не мае ні аднаго кілёграму для забесьпячэньня рабочых. У той-жа самы час у суседніх саўгасах і калгасах дарэмна гінуць дзесяткі тысяч пудоў фруктаў.

Кавалёў і Навахоў.

ЗГУБЛЕНЫЯ ЗАДАНЬНІ

Тав Флеер, дзе-ж ваш транспарт?

Менск ужо некалькі дзён застаецца бяз бульбы і іншай гародніны. Аднэй з асноўных прычын такога становішча зьяўляецца злачынна дрэнная работа раённых нарыхтоўчых арганізацый па загатоўцы і галоўным чынам, па вывазе агародніны в раёнаў у рабочыя цэнтры.

Два матар'ялы, якія паступілі сёньня ў ЦКК-РСІ, сьведчаць аб безадказнасьці раённых арганізацый і Менскага ЦРК у справе забесьпячэньня рабочых гародніной. Інструктар Белкаапсаюзу абсьледваў працу **Капыльскага раённага спажывецкага т-ва** па загатоўцы гародніны і ўстанавіў поўную бязьдзейнасьць яго па забесьпячэньні рабочых гор. Менску гародніной. У спажывецкім т-ве былі нават згублены заданьні на загатоўку. Два дні прыйшлося шукаць інструктару пляны раённага спажывецкага т-ва, якія з вялікай цяжкасьцю былі знойдзены.

Інструктар паставіў гэта пытаньне на бюро Капыльскага раённага камітэту партыі. Бюро райкому прыняло з гэтага поваду апартуністычную пастанову, у якой ні адным словам не спынілася на злачынных адносінах каапэрацыі да загатоўкі і вывазу агародніны ў рабочыя цэнтры. Бюро раённага камітэту ня лічыла патрэбным даць якія-б там ні было паказаньні раённаму спажывецкаму т-ву аб тэрміновай арганізацыі вывазу, а абмежавалася пастановай наступнага характару:

Прасіць Белкаапсаюз паслаць аўтамабілі ў раён.

Мусіць рабочыя Менску павінны чакаць пакуль Белкаапсаюз атрымае аўтамабілі і пашле іх у раён.

Вось яшчэ факт. Для дапамогі Менскаму ЦРК па забесьпячэньні рабочых гародніной, выехала ў Самахвалавіцкі раён у калгас «Чырвоны Спэцыяліст» рабочая брыгада, каб арганізаваць вывазку бульбы ў Менск. МЦРК абяцаў да 4-й гадзіны дня паслаць на Койданаўскі гасьцінец транспарт для атрыманьня гэтай бульбы. Але свайго абяцаньня ён ня стрымаў. Рабочым і калгасьнікам, якія дапамагалі брыгадзе, давялося чакаць транспарту і зьвярнуцца ў НК РСІ за дапамогай. Перагаворы прадстаўніка НК РСІ з МЦРК скончыліся тым, што член праўленьня МЦРК тав. **Флеер** абяцаў высьвятліць справу, і праз 10 мінут паведаміць. Калі прадстаўнік НК РСІ зноў названіў у МЦРК, у апараце нікога ўжо не аказалася, бо ўжо было чвертка пятае. Так і невядома, што стала з бульбай, здабытай рабочай брыгадай.

Далей цярпець такога становішча нельга. Мы павінны тэрмінова спыніць такія адносіны паасобных райкомшчыкаў і каапэратараў да запатрабаваньняў рабочых. Пракурору Менску трэба тэрмінова выявіць на чыёй віне затрымалася пасылка транспарту.

ВЕРБА.

МЕНСК БУДЗЕ ЗАБЯСЬПЕЧАНЫ БУЛЬБАЙ

Вінаватыя ў перабоях перадаюцца суду

У апошнія дні заўважваліся перабоі забесьпячэньня Менску бульбай. Як выявілася, галоўнай прычынай перабояў былі злачынныя адносіны ЦРК, які даў распараджэньне аб спыненьні адгрузкі бульбы ў Менск. Наркамгандлю былі прыняты рашучыя меры—20 жніўня Менску адгружана 4 вагоны бульбы. 21—15 вагонаў. Выдача бульбы насельніцтву пачнецца 22-га, і ў далейшым перабояў ня будзе.

Па распараджэньні Наркамгандлю справа аб перабоях у забесьпячэньні Менску бульбай перадана пракурору рэспублікі для прыцягненьня праўленьня ЦРК і інш. вінаватых да адказнасьці.

Справа будзе разглядацца ў тэрміновым парадку і ў бліжэйшыя дні будуць абвешчаны ў друку яе вынікі.

Праверыць ход загатовак

Пастанова ЦКК КП(б)Б

У ЦКК РСІ паступілі матар'ялы, якія сьведчаць аб бязьдзейнасьці раду раённых нарыхтоўчых арганізацый (Капыль, Койданава, Пухавічы, Гарадок і інш.) у нарыхтоўцы і вывазе ў рабочыя цэнтры (Менск, Віцебск, Гомель і інш.) плодагародніны, якая ёсьць у раёнах у дастатковай колькасьці. З гэтых матар'ялаў відаць таксама, што райкомы і райвыканкомы гэтай справай зусім ня цікавяцца і пакідаюць беспакаранай усю гэту злачынную бязьдзейнасьць нарыхтоўчых арганізацый.

Выходзячы з гэтага, прэзыдыум ЦКК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Прапанаваць усім РК і РВК у трохдзённы тэрмін праверыць ход нарыхтовак плодагародніны і ў першую чаргу выкананьне нарадаў на вываз у гарады, прыцягнуўшы да суровай партыйнай і крымінальнай адказнасьці асоб, вінаватых у зрыве плянаў рабочага забесьпячэньня.

2. Прапанаваць раённым арганізацыям пад асабістую адказнасьць старшынь РВК ужыць на месцы неабходныя мерапрыемствы, якія забясьпечваюць рэгулярны вываз плодагародніны ў гарады, не дапусьціўшы ніякіх перабояў у выкананьні нарадаў.

3. Белкаапсаюзу і ЦРК накіраваць у асноўныя раёны сваіх інструктароў і рабочыя брыгады для праверкі ходу нарыхтовак і вывазу бульбы і гародніны ў гарады.

4. Наркамгандлю, Белкаапсаюзу, Садсаюзу і ЦРК прапануецца паведамляць НК РСІ аб фактах парушэньня раённымі арганізацыямі плянаў вывазу бульбы і іншай гародніны.

Нам. старшыні ЦКК КП(б)Б ІВАНОЎ.

400 рабочых пакінуты без сталовай і буфэту

У Копысі на кафэльных заводах працуе каля 400 рабочых. Ня гледзячы на гэта, праўленьне спажывецкага т-ва амаль зусім не зварачае ўвагі на забесьпячэньне гэтых рабочых. На заводзе не арганізавана сталоўка, няма буфэту. Рабочаму для таго, каб паабедаць прыходзіцца хадзіць каля 2-х кілёмэтраў, прастойваць у чарзе па 2-3 гадзіны. Праўленьне спажывецкага т-ва ўсё спрачаецца каму адкрыць сталоўку: ЦРК, заводу ці райвыканкому. Рабочыя зусім не забясьпечаны гародніной. Спажывецкае т-ва лічыць, што гэта справа нерэнтабельная. Рабочы вымушаны зварачацца на прыватны рынак і плаціць у два-тры разы даражэй.

Плян загатовак масла нявыканан. У крамах няма тавараў для прэміяваньня ўдатчыкаў масла і лёх, за выключэньнем шоўкавых панчох і адэкалёну. Пры спажывецкім т-ве ёсьць адкормачны пункт, які знаходзіцца ў вельмі антысанітарных умовах. 33 сьвінаматкі ўжо закормлены і няпрыгодны як матачны матар'ял.

Паводле пастановы раённай партарганізацыі, спажывецкае т-ва павінна было арганізаваць прыгарадную фэрму на 500 кароў і сьвінную гаспадарку на 800 сьвіней. Плошча ў 400 гэкт. ужо адведзена. Для пачатку работы ёсьць некаторыя сродкі, праўленьне-ж т-ва чамусьці марудзіць з гэтай справай і дагэтуль не прыступіла да стварэньня фэрмы. Апартуністычнай практыцы спажывецкага т-ва трэба пакласьці канец.

Ф.

Падцягнуць адсталыя вучасткі

Гэтымі днямі ў Наркамфіне БССР адбылася нарада працаўнікоў НКФ, Галоўнай ашчаднай касы і т. т., якія выяжджалі на абсьледваньне ў Аршанскую, Мазырскую і Магілеўскую акругі на нытаньні аб рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка за чатыры гады».

Нарада адзначыла, што прафарганізацыі прымаюць вельмі слабы ўдзел у рэалізацыі пазыкі. Пастаноўлена прасіць ЦСПСВ прыняць меры, каб ажывіць і актывізаваць работу нізавых праф арганізацый.

У сувязі з матар'яламі зьмешчанымі ў газэце «Зьвязда», аб недапушчальнай бязьдзейнасьці Дубровенскай гарадзкой камісіі садзейнасьці, нарада зьвярнулася ў цэнтральную камісію садзейнасьці з просьбай заслухаць у тэрміновым парадку даклад Дубровенскай гарадзкой камісіі.

Нарада адзначыла злачынныя адносіны да рэалізацыі пазыкі загадчыка ашчаднай касы на Асінторфе (гл. газ. «Зьвязда» ад 19 жніўня) і прапанавала галоўнаму кіраўніцтву ашчаднымі касамі перадаць справу пракуратуры.

Адзначана зусім недапушчальнае ігнараваньне інтарэсаў трымальнікаў цазык з боку заг. мазырскай гарадзкой ашчаднай касы, які адмовіў рабочым і сялянам у праверцы іх аблігацый. Галоўнаму кіраўніцтву ашчаднымі

Рабочая канфэрэнцыя Кастрычніцкага раёну

Мабілізаваць энтузіязм мас на ліквідацыю прарываў

Давесьці прамфінплян да кожнага цэху і рабочага

ДАКЛАД тав. ДВАРЭЦКАГА

19 жніўня ў клюбе мэталістых адкрылася беспартыйная рабочая канфэрэнцыя Кастрычніцкага раёну, на якой прысутнічалі да 300 дэлегатаў фабрык і заводаў раёну.

З дакладам аб выкананьні прамфінпляну і аб падрыхтоўцы да новага гаспадарчага году выступіў прадстаўнік ВСНГ БССР т. **Дварэцкі.**

— Калі мы маем некаторыя дасягненьні ў колькасных паказальніках— адзначыў т. Дварэцкі, дык значна горш абстаіць справа з выкананьнем якасных паказальнікаў прамфінпляну. Завод «Энэргія», замест намечанага па пляну зьніжэньня сабекошту на 17 проц., выканаў толькі на 13 проц., абутковая фабрыка замест 9,7 проц.—5,1 проц., завод «Бальшавік» замест 11,6 проц. толькі 4 проц. За 42 дні, якія засталіся да канца 2-га году пяцігодкі, трэба ва што-б там ні стала ліквідаваць гэтыя прарывы.

Барацьба за зьніжэньне сабекошту прадукцыі ў нашых умовах набывае асабліва вялікае значэньне. Даволі адзначыць, што 1 проц. зьніжэньня сабекошту па фабрыках і заводах БССР складае 1 млн. руб.

На радзе фабрык мы маем яшчэ вялікія прарывы ў адносінах **ПРАЦОЎНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ.** Барацьба з прагуламі праводзіцца яшчэ слаба. За апошні час мы маем рост прагулаў. Так, калі ў кастрычніку 1929 г. на заводзе «Энэргія» процант прагулаў складаў 0,86 проц., дык у ліпені г. г. ён ужо вырастае да 1,69 проц. Такое-ж становішча і на радзе інш. прадпрыемстваў.

Культае ўсё яшчэ **якасьць прадукцыі.** На гэты важнейшы вучастак увагі не зварачаецца належная ўвага. Абутковая фабрыка ў Менску ўсіх запэўняла, што колькасьць браку складае ўсяго толькі 3 проц. Брыгада, якая зрабіла праверку якасьці прадукцыі на фабрыцы, высьвятліла, што процант браку дасягае 20 проц. Прычына браку—адсутнасьць якога-б там ні было кантролю. Зараз, калі кантроль па цэхах устаноўлены, брак зьніжаўся да 8 проц.

Ня ўсе гаспадарнікі асьвядомілі ўсю важнасьць барацьбы за добраякасную прадукцыю. Дырэктар гуты «Пралетары», напрыклад, заявіў, што завод выпускае атрамантныя бутэлькі, якія пасьля скарыстаньня, выкідваюцца і таму, якасьць гэтых бутэлек можа быць і дрэнная. Гэтакія адносіны да якасьці прадукцыі недапушчальны.

Барацьба са стратамі на прадпрыемствах яшчэ не разгорнута належным чынам. Вось прыклад: на абутковай фабрыцы можна сустрэць цэлыя горы кавалкаў тавараў, якія ляжаць пад дажджом і псуюцца. Такое-ж становішча на заводзе «Бальшавік» і на інш. заводах. Рад машын ня мае поўнай нагрузкі. Прафарганізацыі, гаспадарнікі да гэтага часу мала што зрабілі для барацьбы са стратамі.

Асноўнай прычынай прарываў зьяўляецца **недавядзеньне пляну да цэху,** варштату і да кожнага рабочага паасобку. Дырэктыва партыі аб давядзеньні прамфінпляну да кожнага рабочага ў жыцьцё не праведзена. Трэба так паставіць работу, каб кожны рабочы ведаў, што ад яго патрабуецца, што ён павінен зрабіць для выкананьня прамфінпляну.

За апошні час значна павялічылася цякучасьць рабочай сілы на нашых прадпрыемствах. У некаторых мясцох гэта цякучасьць дасягае 30 проц. Калі-б на гэту справу зьвярнулі належную ўвагу, разагрнулі-б адпаведную масавую работу, цякучасьць значна паменшылася-б. Рабочая канфэрэнцыя павінна спыніцца на гэтым пытаньні і выпрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы для барацьбы з «лятунамі».

У заключэньне т. Дварэцкі спыніўся на пытаньні аб ударництве і сустрэчным прамфінпляне.

Спрэчкі па дакладу тав. Дварэцкага

Якія прычыны невыкананьня прамфінпляну на радзе прадпрыемстваў? Як ліквідаваць прарывы?

Вось асноўнае, аб чым гаварылі дэлегаты канфэрэнцыі ў спрэчках па дакладзе тав. Дварэцкага.

Ці магчыма ліквідаваць прарывы? Бязумоўна, магчыма. Зусім правільна паставіў пытаньне дырэктар заводу «Энэргія» тав. **Атрошка:** «Трэба яшчэ больш мабілізаваць энтузіязм і ініцыятыву рабочых мас, трэба рацыяналізаваць і ўвязаць работу цэхаў, зьнішчыць усе тормазы ў працэсе вытворчасьці».

Але ці робіцца гэта хаця-б на самым заводзе «Энэргія»?

На жаль, не. Рад прамоўцаў—дэлегатаў ад «Энэргіі» (**т. т. Гінзбург, Гнедзько, Бялкоўскі, Пэсін, Іваноў**) выразна падкрэсьлілі, што на заводзе далёка ня ўсё зроблена для мабілізацыі рабочых мас вакол выкананьня прамфінпляну. Адміністрацыя «Энэргіі» і заводзкія арганізацыі яшчэ ня ўсё зрабілі для стварэньня патрэбнай абстаноўкі, для максымальна інтэнсыўнай работы ў цэхах.

Рабочыя прапановы часта марнуюцца ў папках заводакіраўніцтва. Рацыяналізатарскія мерапрыемствы застаюцца на паперы. Прамфінплян не даведзены да асобнага рабочага.

Якасьць прадукцыі? На многіх прадпрыемствах гэта пытаньне зьяўляецца самым хваравітым. Тав. **Фэльдман** (дэлегат абутковай фабрыкі) паказаў канфэрэнцыі, якую прадукцыю паслала гарбарня «Бальшавік» на абутковую фабрыку. Гэта скура наскрозь перагарэла і лёгка рвецца. Зусім ня дзіўна, што спажывец скардзіцца на выпрацоўку абутковай фабрыкі, бо куды варты абутак, выпрацаваны з такой скуры. Тав. Фэльдман паказаў таксама пару бацінак—прадукцыі абутковай фабрыкі. Тут ужо давялося чырванець дэлегатам абутковай фабрыкі. Бацінкі былі з патрэсканымі падэшвамі, вінты выпадалі з іх, бацінкі разваліваліся.

Ці прымаюцца патрэбныя меры для паляпшэньня якасьці прадукцыі? На жаль, не. На барацьбу за якасьць прадукцыі не мабілізаваны масы.

Тав. Габай (гарбарня «Бальшавік») гаворыць, што склад на гарбарні вельмі кепскі, тавар псуецца, а адміністрацыя не зварачае на гэта ўвагі. Яшчэ ў мінулым годзе адміністрацыя гарбарні была аддадзена пад суд за псаваньне тавараў. Але і гэта не дапамагло. Ня гледзячы на тое, што ў мінулым годзе сапсавалася тавару на 20-30 тысяч рублёў, адміністрацыя ня прыняла мер для пабудовы новага складу. Яна абмежавалася толькі тым, што... павялічыла абслугоўваючы штат складу з 60 да 120 чалавек. Камэнтарыі не патрэбны.

Тав. Габай завастрыў увагу на пытаньні забесьпячэньня рабочых прадуктамі ў буфэтах і заводзкіх сталоўках. Ля буфэтаў вялізныя чаргі, рабочыя губляюць шмат часу на атрыманьне прадуктаў, што, бязумоўна, адбіваецца на інтэнсыўнасьці працы. Вывае і так, што на чаргі траціцца і рабочы час.

У спрэчках выступілі яшчэ т. т. **Красік (малочны завод), Камэндантаў** (зав. «Чырвоная Зорка»), **Жырко** (ф-ка абутку), **Пячатнікаў** (хэмфармзавод), **Кузьміцкі** (ваенвед) і інш.

У заключным слове тав. Дварэцкі адказаў на ўсе пастаўленыя дэлегатамі канфэрэнцыі пытаньні.

23-га жніўня, а 7 гадз. увеч., у залі б. Мен. АК КП(б)Б (3-ці паверх) склікаецца **нарада сакратароў партканцэлярыяў і ячэек КП(б)Б** па пытаньні аб правядзеньні **месячніку самаправеркі беларусізацыі.** Апрача сакратароў ячэек, на нараду выклікаюцца наступныя таварышы: **Мітлін** (рэдакцыя «Зьвязда»), **Шастакоў** (Дзяржплян), **Кучынскі** (рэд. «Савецкая Беларусь»), **Платун** (НКА), **Дварэцкі** (ЦК працаўсьветы), **Ігнатоўскі, Казак і Бялуга** (БАН), **Красьнеўскі**(«Зьвязда»),**Шпілеўскі**(БАН), **Савіч і Аўчыньнікаў** (Камвуз), **Шмідт** (Рэдакцыя «Бел. Вёска»), **Бучунас і Некрашэвіч** (БДВ), **Канакоцін, Танхілевіч, Гаруновіч, Белашэўскі, Лабадаеў, Модаль** (ЦК КП(б)Б), **Масюкоў** (НКЗ БССР), **Гурскі** (НКА), **Табайнін** (ВСНГ), **Мэрэнгоф** (Наркамгандлю), **Жылуновіч** (БАН), **Фрыдман і Бэнэн** (СНК), **Хацкевіч і Мікуліч** (ЦВК), **Яцкевіч** (Галоўшос), **Галкін** (Белдзяржкіно), **Цэнцыпэр** (НКАХ), **Файнгаўз** (ЦП мэдсанпрацы), **Рычкоў** (ЦП Асьветы), **Самуцін** (рэд. «Чыр. Зьмена»), **Папоў** (рэд. «Зьвязда»), **Галавач** (БелАПП), **Кобец** (рэд. «Рабочий»), **Абрамсон** (Наркамгандлю), **Спэктар** (СНК), **Анодзін** (Палітэхнікум), **Чарнабродаў** (НКА), **Калмык** (ЦК МОПР'у), **Шындлер** (Дзяржплян), **Папова** (ЦП працмастацтва), **Ізраіліт** (Лесбел), **Палякоў** (Белпайгандлю), **Ануліч** (Белпэдтэхнікум), **Валабрынскі** (БНВ), **Гольдбэрг** (СНК), **Мямзэвіч** (рэд. «Зьвязда»), **Цывунчык** (Камвуз), **Бялуга** (НКА), **Гальбрайх** (інспэктар НКА), **Гнілякевіч** (НК працы), **Матусаў** (Белдзяржкіно), **Скараход** (ВСНГБ), **Бапцін** (Наркамгандлю) і **Шчацько** (Дзяржстрах).

Запрашаюцца прадстаўнікі газэт. Яўка сакратароў ячэек і памянёных таварышоў абавязкова.

ФРУНЗАЎСКІ РК КП(б)Б.

ПАСТАНОВА

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра структуру і штаты раённых выканаўчых камітэтаў і сельскіх саветаў у сувязі з ліквідацыяй акруг

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР у сувязі з ліквідацыяй акруг і ў адпаведнасьці з пастановай Прэзыдыуму ЦВК Саюзу ССР за 9 жніўня 1930 г. «Пра структуру і типовыя арыентыровачныя штаты раённых выканаўчых камітэтаў» («Изв. «ЦИК СССР і ВЦИК» за 10 жніўня 1930 г. № 219) пастанаўляюць:

Устанавіць наступную структуру і штаты раённых выканаўчых камітэтаў і сельскіх саветаў БССР.

1. Па раённых выканаўчых камітэтах:

	ШТАТЫ		
	У раёнах з насельніцтвам да 50000 чал.	У раёнах з насельн. ад 50000 чал. да 80000 чал.	У раёнах з насельн. звыш 80000 чалавек
Старшыня	1	1	1
Сакратар	1	1	1
Інспэктар гандлю	1	1	1
Інспэктар па камунальнай гаспадарцы (тэхнік)	1	1	1
Інспэктар па дарожному будаўніцтву (тэхнік)	1	1	1
Інспэктар па санпільным выхаваньні	1	1	1
Інспэктар па палітасьвеце і ліквідацыі непісьменнасьці	1	1	1
Інспэктар аховы здароўя	1	1	1

Абавязкі інспэктара аховы здароўя ўскладзі на санітарнага ўрача, а ў тых раёнах, дзе апошняга няма — на ўрача раённай больніцы.

Устанавіць пасаду інструктара па савецкім будаўніцтве ў раёнах з насельніцтвам звыш 40.000 чалавек.

Устанавіць пасаду інспэктара працы ў раёнах, дзе няма упаўнаважаных Сацстраху. У тых раёнах, дзе ёсьць упаўнаважаны Сацстраху—ускласьці на апошняга абавязкі інспэктара Працы.

	ШТАТЫ		
	У раёнах з насельніцтвам да 50000 чал.	У раёнах з насельн. ад 50000 чал. да 80000 чал.	У раёнах з насельн. звыш 80000 чалавек
Агульны Аддзел			
Загадчык Аддзелу	Сакратар РВК		
Тэхнічны Сакратар Прэзыдыуму РВК і па агульных справах	1	1	1
Дзелавод	1	1	2
Экспэдытар	1	1	1
Машыністка	2	2	2
Тэхнічны абслугоўваючы персанал	3	3	3
Зямельны Аддзел			
Загадчык	1	1	1
Раённы аграном	1	1	1
Райзямупрадкавацель	1	1	1
Тэхнічны сакратар	1	1	1
Фінансавы Аддзел			
Загадчык	1	1	1
Інспэктар па бюджэту	1	1	1
» » прыбытках і крэдыту	1	1	1
» дзяржстраху	1	1	1
Бухгальтар	1	1	1
Рахункавод	—	1	1
Тэхнічны сакратар	1	1	1
Адміністрацыйны Аддзел			
Начальнік	1	1	1
Нам. Начальніка	Пакінуць існуючы штат		
Агент Крымвышуку	1	2	2
Тэхнічны сакратар	1	1	1
Справавод	—	1	1
РКК—РСІ			
Старшыня	1	1	1
Інспэктар	1	1	2
Плянава-статыстычная частка			
Эканаміст-плянавік	1	1	1
Старшы статыстык	1	1	1
Статыстык	1	1	2

Арганізацыйнымі пытаньнямі павінны займацца (апроч інструктара па савецкім будаўніцтве, дзе ён ёсьць) старшыня раённага выканаўчага камітэту, намесьнік старшыні раённага выканаўчага камітэту і сакратар раённага выканаўчага камітэту.

Інструктар па савецкім будаўніцтве таксама вядзе работу сярод беднаты і па справах бытавых і нацыянальных.

Кіраваньне плянава-статыстычнай працай ускладзецца на старшыню раённага выканаўчага камітэту.

Бухгальтар і рахункавод фінансавага аддзелу павінны абслугоўваць ўвесь раённы выканаўчы камітэт.

2. Па сельскіх саветах:

	ШТАТЫ	
	У сельсаветах з насельніцтвам да 3.000 чалавек	У сельсаветах з насельніцтвам звыш 3.000 чалавек
Старшыня	1	1
Сакратар	1	1
Рахункавод-статыстык	—	1

3. Вызначаная структура і штаты устанаўляюцца з моманту ліквідацыі акруг і зьяўляюцца абавязковымі для ўсіх раённых выканаўчых камітэтаў і сельскіх саветаў.

Далейшыя зьмены ў вызначаных штатах могуць рабіцца Народным Камісарыятам РСІ ў агульным парадку, паводле існуючага заканадаўства.

Вык. аб. старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Хацкевіч.

Намесьнік старшыні Савету Народных Камісараў БССР **Н. Бэнэн.**

За сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Сташэўскі.

20 жніўня 1930 г.,
г. Менск.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

ПТ ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 2 верасьня 1930 году а 18 з палов. гадз. будуць разглядацца справы наступных т. т.: **Марголіна Л. Б., Мялешка І. В., Лабаноўскага Р. С., Грабнёва Г. Х., Палоньніка М. І., Лапуха З. М., Фрыдмана А. Н., Зуевіча Н. Ц., Начура Е. А., Станкевіча Р. С., Захаравіча Г. Р., Собаля П. Г., Крэч П. Л., Клябанава Х. С., Шыдлоўскага А. С., Карпава А. С., Медзяляна А. П., Левіна В. Г.**

Памянёныя таварышы запрашаюцца для прыняцьця ўдзелу пры разглядзе іх спраў. Таксама запрашаюцца сакратары ячэек, дзе яны лічацца на вучоце, якія знаходзяцца ў Менску.

Да ўвагі прац. БДУ. МК БДУ гэтым паведамляе, што 20, 21, 22, 23, 24 жніўня 1930 г. абвешчаны днямі індустрыялізацыі.

Усе працаўнікі БДУ павінны зьбірацца каля мясцкому БДУ для адпраўкі на працу. Кожны працаўнік прыходзіць у адзін з вышэйпамянёных выхадных дзён а 7 гадзін раніцы.

22-га жніўня ў 12 г. бібкалектар (дом працы, 2-гі паверх) склікае агульны сход усіх палітасьветных і прафсаюзных бібліятэкараў.

Парадак дня: 1) Даклад аб рэарганізацыі калектара, 2) Інфармацыя інспэктара палітасьветы аб бюджэце палітасьветных бібліятэк.

У суботу 23-га жніўня а 5 гадз. увечары склікаецца **збор дружыньнікаў МДПО.**

Яўка абавязкова.

— **БДУ.** 24 жніўня а 7 гадз. увеч. у фізычнай аўдыторыі пэдфаку адбудзецца **агульны сход навуковых працаўнікоў пэдфаку БДУ.** Парадак дня: аб арганізацыі новага навучальнага году.

— **Дзенны рабфак БДУ.** Іспыты паступаючых на ўсе курсы рабфаку пачнуцца 23 жніўня а 9 гадз. раніцы. Яўка паступаючых абавязкова. Асабістыя паведамленьні аб яўцы на іспыты пасылацца ня будуць.

22 жніўня а 16½ гадз. у памяшканьні чырвонага кутку шчаціннай фабрыкі (рог Калініўскай і Біржавога зав, № 14/2) адбудзецца **пасяджэньне бюро скаргаў НК РСІ.** На пасяджэньне выклікаюцца рабочыя засядацелі т. т. **Простак, Пятрушкін і Фэйгін** (шчацінная фабрыка), **Рубенчык, Раговіч, Міхаілаў і Шманаў** (зав. «Драваапрацоўшчык»), **Кроль, Карасік, Кузінец, Маршак і Качан** (зав. «Энэргія»).

Кастрычніцкі РК КП(б)Б склікае 22 жніўня а 7 гадз. увеч. у клюбе імя Леніна (пас. вакзал) **нараду сакратароў ячэек, арганізатараў сэктароў партвучобы і сэктароў масавай працы.** Парадак дня: 1) аб сетцы масавай партасьветы на 1930-31 навуч. год; 2) аб ходзе прапрацоўкі пастаноў XVI зьезду УсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б; 3) аб справаздачна - перавыбарчай кампаніі делегацкіх сходаў; 4) аб камплектаваньні вячэрняга рабочага ўнівэрсытэту і камвузу; 5) аб ходзе падпіскі на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады».

Яўка вышэйпаказаных таварышоў абавязкова і без спазьненьняў.

Даводзіцца да ведама студэнтаў **вячэрняга рабочага ўнівэрсытэту,** што з 22 да 25 жніўня ад 5 да 10 гадз. увечары ў канцылярыі вячэрняга рабочага ўнівэрсытэту (фізычны інстытут БДУ) будзе перарэгістрацыя ўсіх студэнтаў. Яўка ўсіх студэнтаў абавязкова. Тых, што ня зьявяцца, будуць лічыцца мэханічна выбыўшымі з ліку студэнтаў ВРУ.

— **Клюб навуковых працаўнікоў,** пасьля летняга перапынку, адкрыты штодзённа з 6 гадз. увечары.

Час. вык. абав. адказ. рэдактара
А. МІТЛІН.

ЗЭЛІМХАН

Дом АСЬВЕТЫ. 25 жніўня
КАНЦЭРТ Ленінградзкага ансамблю заслужаных артыстых
У СКЛАДЗЕ: **П. П. Гайдэбурава, Н. Ф. Скарской, М. А. Дабрыніна, Б. Д. Пэна, З. І. Бародзіной, Т. П. Ярмоліной.**
Пачатак канцэрту роўна а 9 гадз.
Білеты ў канцылярыі Дому з 11—2 і з 6—10 г. веч.

Кіно-тэатр „Культура" — Лепшая камэдыя ў 7 частках **МАЛПАВЫ ТЭАТР** У галоўнай ролі вядомы сусьветны комік **СІД ЧАПЛІН.** Пачатак роўна а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал — Новы мастацкі фільм вытворчасьці «СОВКІНО» **ФРЫЦ БАУЭР** Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз.

КІНО „Пралетары" — **2-гі тыдзень 2-гі** выключны мастацкі фільм **САЛАМБА** Гістарычная трагэдыя ў 7 частках. Пачатак 1 сэансу 7 г. Каса—адчынена ад 5 г.

КІНО Сад — МАСТАЦКІ ФІЛЬМ **ЗЛОДЗЕЙ** драма ў 6 част. **толькі 2 сэансы** Пачатак 1-га сэансу а 9 г. веч. Каса адкрыта с 6 гадз.

КІНО „Спартак" Ад аўторка 19 жніўня — НЯМЕЦКІ БАЯВІК **Жыцьцё за Жыцьцё** Драма ў 10 частках УВАГА! з прычыны працяжнасьці карціны, пачатак сэансаў —**6 г.30 м., 8 г. 30 м., 11 г. 45 м.** КАСА АДКРЫТА з 5 гадз.

ПРЫЙМОВАЯ КАМІСІЯ ПЭДФАКУ БДУ

даводзіць да ведама ўсіх падаўшых заявы для паступленьня на пэдфак, што

прыймовыя іспыты пачнуцца 26-га жніўня

а 10 гадзіне раніцы ў прыродазнаўчым корпусе (Унівэрсытэцкі гарадок).

Іспыты павінны трымаць усе асобы, якія ня маюць закончанай сярэдняй асьветы і скончыўшыя 9 годкі да 1928 г., (настаўнікі, скончыўшыя 9 годкі і інш. да іх прыраўненыя школы ад іспытаў вызваляюцца).

Прыймовая камісія.

БЕЛАРУСКАЯ КАНТОРА **„САЮЗТРАНС"**
у другі раз даводзіць да ведама грузаадпраўлельцаў, што
ГРУЗЫ МАЛАЙ ХУТКАСЬЦІ
прымаюцца да адпраўленьня:
1) У напрамку на Маскву МБВ у нацотныя лічбы: (1, 3, 5 і. г. д.)
2) У напрамку на Жлобін, Бахмач і за межы ў цотныя лічбы: (2, 4, 6 і г. д.)
Папярэджваем, што грузы, прывезеныя на таварны двор для адпраўкі у неўстаноўленыя дні, прымацца не будуць і будуць зварочвацца назад у горад
Саюзтранс.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР — Пятніца, 22 жніўня
КАНЦЭРТ Ленінградзкага ансамблю.
Заслужаны артыст рэспублікі **П. П. Гайдэбураў** Монаскэтч „Беглец"
Артыстка балету **З. І. Бародзіна.** „Танец испанского нищего" „Северный танец" і інш.
Заслужаны артыст рэспублікі **П. П. Гайдэбураў** — і — заслужаная артыстка рэспублікі **К. Ф. Скарская** выканаюць клясычны тратэск **„Бальзаміна ўшчына"** (Па Астроўскаму і ў сучаснасьці).
Артысты акадэмічнай опэры **Б. Д. Пэн** опэрныя арыі, рамансы і сьпевы.
Артысты эстрады **Марк Дабрынін** „Первая конная", „Бюрократики и волокитчики" і інш.
Піяністы-вольны мастак **Т. П. Ярмоліна** Ліст, Шопэн, Пракоф'еў і інш.
Канфэрансье **Марк Дабрынін.**
Білеты прадаюцца ў рабочай касе з 12—2 і з 4—6 гадз. веч, і ў касе тэатру.
Пачатак канцэрту роўна а 9 г. веч.

Мастацкі ЦЫРК — Пад кіраўніцтвам І. Л. СТРАШЭВІЧА
ПЯТНІЦА, 22 ЖНІЎНЯ
СЁНЬНЯ
прымае ўдзел поўны ансамбль трупы ЕДЗЕ ЛАНГО!!!
Наезьнікі, акрабаты, жанглёры, гімнасты, эксцэнтрыкі, віртуозы, антыпадыстыя, музычныя сатырыкі, буфанадныя клёуны, гумарыстыя
Муштраваныя жывёлы пад кіраўніцтвам **РУСЕЛЬ і інш. №№**
Пачатак а 8 г. 30 м.
Канфэрансье **Е. А. Нугенаў**
Едуць новыя артыстыя
Адказны кіраўнік І. СТРАШЭВІЧ.
Нядзеля, 24 жніўня **РАНІШНІК** Цана ад 40 к.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
Вышла з друку і паступіла ў продаж ва ўсіх кнігарнях БДВ і спажыўкаапэрацыі.
М. ГАЛАДЗЕД і РАЧЫЦКІ.—Калгасны рух і ўздым сельскай гаспадаркі.
(Даклады на XIII зьезьдзе КП(б)Б). Стар. 79. Цана 10 кап.

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва.
Вышла з друку і паступіла ў продаж ва ўсіх кнігарнях БДВ і спажыўкаапэрацыі:
ЛЁГКАЯ КАВАЛЕРЫЯ (рэд. ЦК ЛКСМБ).
Стар. 76. Цана 15 кап.

ВЫСТАУКА ДРУКУ
Беларуская Дзяржаўная Бібліятэка (Савецкая, 94)
у дадатак да 1-й Усебеларускай выстаўкі ў памяшканьні бібліятэкі адкрывае
ВЫСТАУКУ ДРУКУ
Для экскурсій наладжваецца агляд новага будынку бібліятэкі. Выстаўка працуе з 12 жніўня да 10 кастрычніка штодзенна ад 12 гадз. дня да 10 гадз. веч. Уваход вольны.

Даводзіцца да ведама студэнтаў
Беларускага Зоатэхнічнага Інстытуту
(у Горках),
што **ЗАНЯТКІ** са студэнтамі веснавога ПРЫЁМУ 1930 году распачынаюцца з 5-га верасьня,
да якога тэрміну ўсе павінны зьявіцца.
Лягерны збор пераносіцца на кастрычнік месяц.

ПРЫЙМОВЫЯ ІСПЫТЫ ВА ЎСЕБЕЛАРУСКУЮ СЛЎПАРТШКОЛУ пачнуцца **24 жніўня,**
да якога часу павінны зьявіцца ўсе таварышы, падаўшыя заявы (дапушчаныя да прыймовых іспытаў).
Зьявіцца трэба ў г. Гомель, парк імя Луначарскага.
Саўпартшкола.

У МЕНСКІЯ ВЯЧЭРНІЯ РАБОЧЫЯ ШКОЛЫ ПАВЫШАНАГА ТЫПУ
АДКРЫТ ПРЫЁМ ЗАЯУ АД УНОЎ ПАСТУПАЮЧЫХ І РЭГІСТРАЦЫЯ СТАРЫХ ВУЧНЯУ
штодзенна ад 7 да 10 г. веч. у канцылярыях школ
Школа № 1 (беларуская) Міхалаўская, 4
» № 2 » Інтэрнацыянальная, 31
» № 3 » Савецкая, 44.
» № 4 » Падгорны зав., 8.
» № 5 (яўрэйская) Энгельса, 8
» № 6 » Рэвалюцыйная, 22
» № 7 » Камсамольская, 40
» № 8 (беларуская) Загарадная, 1-14
Анкеты і ўсякія спраўкі ў канцылярыях паказаных школ ад 7 да 10 гадзін увечары з **18 жніўня па 5 верасьня.**
Менгарінспэктарыят Нарасьветы.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА КАМІТЭТУ ЎЗЕМАДАПАМОГІ
Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў,
АДКРЫТА ад 9 гадз. раз. да 9 г. вач.
Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:
па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.
Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.
Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 6 г. да 8 г. увеч.
ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. веч. штодзенна
Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на даму па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 9 гадз. веч.
Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту Для ўсіх іншых грамадзян за агульнадаступную дыфэрэнцыяваную плату.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
Да ведама школ, райінспэктуры, гарінспэктароў, і кнігагандлёвых арганізацый.
Вышлі з друку, паступілі ў продаж і рассылаюцца па запыт.
Міхась Лойка.— Рабочая кніга па матэматыцы. Для другога году навучаньня. Стар. 237. Цана 70 кап.
Касьмовіч, Кіпель, Троська.—Жывелы і значэньне іх для чалавека. Рабоча-навучальная кніжка для 6-га году навучаньня. Стар. 432. Цана 1 р. 80 к.
ПРАГРАМЫ па беларускай мове і літаратуры, расійскай мове і літаратуры і нямецкай мове. Для II канцэтру сямігадовае савецкае палітэхнічнае школы. Стар. 50. Цана 1 р. 25 к.
ПРАГРАМЫ па грамадазнаўстве і геаграфіі. Для II канцэтру сямігадовай савецкай палітэхнічнай школы. Стар. 45. Цана 1 р.
НОВЫ АДМЕНЬНІК ДЭТАЛІЗАВАНЫЯ ПРАГРАМЫ для I II груп 4-х і 7-гадовай савецкай палітэхнічнай школы. Стар. 29. Цана 12 к.

Згубленыя і ўкрадзеныя дакумэнты

лічыць несапраўднымі:

Пасьведч. Смычкова П. П., выд. Мен. ваен. шпіталем 1953
Мэтр. вып., выд. Мен. ЗАГС'ам, асабов. пасьведч., выд. Станькаўск. с.-с. Мінько А. Ф. 1954-1955
Пашп. Опман Е. Я., выд. Мен. міліцыяй 1956
Мэтр. вып. Ідэльчык М. Г., выд. Мен. ЗАГС'ам 1957
Чл. біл. саюзу Нарсувязі № 167719 Самойловіча Ю. О. 1958
Каап. кн. Ліфшыца В. Г., выд. Мен. прыгар. спаж. т-вам «Земляроб» 1959
Пасьведч. дзяжурнага на 6 стр. п., выд. штабам 6 п. 1964
Дам. кн. Субача М. Ф. д. № 1-а па вул. Р. Люксэмбург, выд. Мен. міліцыяй 1965
Бірж. карт., выд. Мен. біржай працы, жэтон на атрым. дапамогі, выд. Мен. страхкасай Кац Б. Я. 1966-1967
Камсам. біл., выд. Рослаўск. кам. УсеЛКСМ, чл. біл. саюзу працасьветы, даведка слухача курсаў па падрыхт. у ВНУ Гершанок Н. І. 1968-1970
Літар № 03173900 Белчанка Р. Т., выд. рабфакам БДУ 1971
Беспрац. кн. Цыбульскай Х. Я., выд. Мен. страхкасай 1972
Вайск. біл., выд. 5 стр. п., чл. біл. саюзу гарбароў, лек. кн., выд. Мен. страхкасай на імя Чайкоўскага П. К. 1973-1975
Фабр. нумар «215» Трубач Г. В., выд. ф-кай «Беларуска» 1976
Біл. слухача Мен. курсаў ЦПП Крыўчык Н. Н. 1977
Вайск. кн. Лютынскага С. Ф., выд. Мен. ваенкаматам 1978
Даведка аб выбарч. правох Клімовіча І. К., выд. Мен. міліцыяй 1979
Вайск. біл. Абуховіча А. А., выд. Мен. ваенкаматам 1980
Вайск. біл., выд. Мен. ваенкаматам, пашп., выд. Мен. міліцыяй на імя Розума М. С. 1981-1982
Мэтр. вып. Кісялёва Ў. Ц., выд. Мен. ЗАГС'ам 1983
Пашп. Токар М., выд. Мен. міліцыяй 1984
Больн. бюлет. Лютаровіча П. І., выд. чыгуначн. амбуляторыяй 1985
Асабов. пасьведч. Плышэўскага Д. І., выд. Узьлянск. с.-с. 1986
Парт. біл., выд. Мен. АК КП(б)Б, чл. был. саюзу гарбароў Клёрына Ш. С. 1987-1988
Асабов. пасьведч. Харлаб Д Ю., выд. Ленінгр. інст. інж. шл. зн. 1989
Пасьведч. на атрым. дапамогі Жалток І. Б., выд. Мен. Акр. сабезам 1990
Бірж. талён Лявіцкага Ф. Е., выд. Мен. біржай працы 1991
Пасьведч. з візай Сабалеўскай Л. П., выд. Ганусінск. с.-с. 1992

15 жніўня г. г. пайшоў з дому душэўна-хворы І. А. Чайкоўскі, жыхар г. Менску, вул. Мопру, д. № 30, кв. 3, 26 год, вышэйсярэдні рост, у шэрым пінжаку і штанах, карычневыя чаравікі, бяз шапкі. Просьба павядамі па вышэйпаказаным адрасе.

Друкарня газ. «Зьвязда», Менск. Менск. Галоўлітбел 337.